ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дастаўкай дадаткам „Прафрук")
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 80 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к. Нашагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры неаплачаным друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. здачку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

ПАНЯДЗЕЛАК, 29 верасьня 1930 г.
№ 228 (3826)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Москва, Б-ко ЮНК СССР
Бібл. студэнт. сьпіс

„Да канца пяцігодкі калектывізацыя СССР павінна быць у асноўным закончана" (І. СТАЛІН)

У ТЫЛУ

Раённыя партарганізацыі яшчэ ня сталі на чале прыліву ў калгасы

Каралінскае раённае кіраўніцтва не рэагавала на праваапартуністычныя „лявацкія" скрыўленьні партлініі ў калгасным будаўніцтве, не змагалася з кулацтвам, тармазіла калектывізацыю ў раёне.

З БАЛЬШАВІЦКАЙ НЕПРЫМІРЫМАСЬЦЮ ЗМАГАЦЦА З ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНЫМ САМАЦЁКАМ, З РЭЦЫДЫВАМІ „ЛЕВЫХ" **ПЕРАГІБАЎ.**

РЫХТУЙЦЕ КАЛГАСНЫ ПРЫБОЙ

ПАСТАНОВА

БЮРО ЦК КП(б)Б АБ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы, уборка і рэзультаты гаспадарчай дзейнасьці ў калгасах найбольш ярка выявілі перад шырокімі бядняцка-сераднякімі масамі сялянства перавагу калектыўнае гаспадаркі і выклікалі новы прыліў асноўных мас сялянства ў калгасы.

Аднак, ЦК вымушаны канстатаваць, што раённыя партыйныя арганізацыі яшчэ ня сталі на чале новага прыліву ў калгасы. Канкрэтна гэта выяўляецца ў наступным:

а) Партыйныя арганізацыі не разгарнулі даволі шырока работы па падрыхтоўцы і арганізацыі новага прыліву ў калгасы. Збожжазагатоўчая кампанія і практычнае ажыцьцяўленьне задач асеньняй сяўбы, якія стварылі спрыяючыя ўмовы для разгортваньня новага прыліву ў калгасы, ня ўвязаны з арганізацыяй гэтага прыліву і ня выкарыстаны ў яго мэтах. У значнай частцы раённых арганізацый пануе праваапартуністычная бязьдзейнасьць і стаўка на самацёк.

б) З боку раду раённых арганізацый не вядзецца даволі рашучага змаганьня з замкнутасьцю калгасаў, што зьяўляецца аднэй з найвялікшых перашкод новаму прыцёку ў калгасы.

в) Дырэктыва ЦК КП(б)Б аб арганізацыі шырокай справаздачнасьці калгасаў перад бядняцка-сераднякімі масамі сялянства большасьцю раёнаў ня выканана.

ЦК КП(б)Б лічыць, што зараз, калі ёсьць усе ўмовы для больш шырокага прыліву ў калгасы, асноўнай перашкодай на шляху прыліву зьяўляецца бязьдзейнасьць раду арганізацый у калгасным будаўніцтве і паслабленьне змаганьня з кулацтвам, што найбольш ярка выявілася пры правядзеньні збожжазагатовак. Гэта знайшло свой адбітак у тым, што па радзе раёнаў ня выяўлены кулакі і праяўлена нерашучасьць у давядзеньні цьвёрдых заданьняў да кулацкага двара і выкананьні тэрмінаў здачы збожжа. Гэтыя зьявішчы ЦК кваліфікуе як праявы правага апартунізму ў рабоце партыйных арганізацый і прапануе весьці з імі (гэтымі зьявішчамі) самае непрымірымае і бязьлітаснае змаганьне.

ЦК КП(б)Б прапануе:

1. Дабіцца рашучага пералому ў рабоце нізавых партыйных арганізацый па арганізацыі новага прыліву. Усю работу па калектывізацыі цесна ўвязаць з правядзеньнем збожжазагатоўчай і асеньняй пасеўнай кампаніямі. Раённыя арганізацыі павінны разгарнуць шырокую масавую палітычную работу сярод бядняцка-сераднякіх мас сялянства, стаць на чале новага прыліву і арганізоўваць яго.

Цьвёрда і нluхільна праводзячы генэральную лінію партыі, весьці рашучае змаганьне з праваапартуністычнымі настроямі, якія ігнаруюць патрэбнасьць упартай работы па далейшым разгортваньні калгаснага руху. Разам з тым ЦК рашуча папярэджвае аб недапушчальнасьці паўтарэньня меўшых месца ў мінулым годзе «левых» загібаў (парушэньне добраахвотнасьці калгаснага руху, адміністраваньне і г. д.).

2. Бязьлітасна змагацца з настроямі самацёку ў калгасным руху і імкненьнямі адкласьці работу па калектывізацыі на зімовы і веснавы час. Неадкладна забясьпечыць выкананьне дырэктыў ЦК аб арганізацыі шырокіх справаздачных сходаў у калгасах перад сялянамі-адзінаасобнікамі, рашуча змагаючыся з ўсякімі праявамі замкнутасьці калгасаў і шырока папулярызуючы дасягненьні калгасаў.

3. Рашуча перабудаваць работу раённых калгасна-кавапэрацыйных арганізацый, падпарадкаваўшы яе задачам усямернага гаспадарчага замацаваньня існуючых калгасаў і арганізацыі новага прыліву. Разам з тым ЦК яшчэ раз падкрэсьлівае абавязак кожнай райпартарганізацыі хутчэй перабудаваць сваю работу такім чынам, каб большасьць раённых адказных работнікаў працавала непасрэдна ў калгасах і сярод бядняцка-сераднякога сялянства, аказваючы ўсямерную дапамогу парт'ячэйкам.

Неабходна забясьпечыць калгасна-кавапэрацыйныя органы сапраўды лепшымі работнікамі, здольнымі пасьлядоўна і да канца ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі.

Аддзелу кадраў у дэкадны тэрмін падрыхтаваць і ўнесьці на разгляд Бюро пытаньне аб узмацненьні работнікамі калгасна-кавапэрацыйнай сыстэмы і аб падрыхтоўцы кадраў арганізатараў калгаснага будаўніцтва.

4. Важнейшай умовай далейшага разьвіцьця калгаснага будаўніцтва зьяўляецца арганізацыйнае і гаспадарчае замацаваньне існуючых калгасаў шляхам правільнай арганізацыі працы, поўнай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і выкарыстоўваньня рабочай і цягавай сілы, шляхам своячасовага і правільнага разьмераваньня ўраджаю і прыбытку калгасу.

5. Забясьпечыць рашучы перапом у разгортваньні работы сярод бядняцка-сераднякіх мас жанчын, выкарыстаўшы перавыбарчую кампанію дэлегацкіх сходаў для актывізацыі мас жанчын на актыўнае змаганьне за ўмацаваньне калгасаў і арганізацыю новых. ЦК КП(б)Б разглядае недаацэнку работы сярод жанчын, як адну з горшых праяў правага ўхілу на практыцы і патрабуе неадкладнага выкананьня дырэктыў аб разгортваньні работы сярод жанчын.

6. У адпаведнасьці з задачамі па арганізацыі новага прыліву ў калгасы патрэбна карэнным чынам палепшыць работу з беднатой. Фактычнае становішча работы з беднатой зьяўляецца абсалютна недапушчальным. Партыйныя дырэктывы па гэтым пытаньні ў радзе месц ігнаруюцца. Райкомам праверыць становішча работы з беднатой усіх арганізацый і прыняць меры да поўнага выкананьня дырэктыў партыі аб рабоце з беднатой.

7. Падрыхтоўчую работу да дня ўраджаю і калектывізацыі і сьвяткаваньне гэтага дня правесьці пад знакам прыліву бядняцка-сераднякіх мас у калгасы.



Калгас «Ленінскі Шлях»
Калгасныя ўдарнікі рамантуюць плуг

УСТУПАЮЦЬ У КАЛГАСЫ

У **Журавіцкім** раёне была праведзена растлумачальная работа сярод сялян аб выгадносьці калектыўнае гаспадаркі, у выніку чаго мы маем прыліў у калгасы. У калгас **«Ленінская Ніва»** ўступілі 32 двары, у «Іскру»—9 двароў. Ужо абагулена наемасьць і праведзена зямляўпарадкаваньне гэтых гаспадарак. Плошча калгасаў пашырылася да 300 га.

Калгасы добра справіліся з уборкай ураджаю і дапамаглі некаторым адзінаасобным бядняцкім гаспадаркам.

ДЭЗЭРТЫРЫ З ФРОНТУ АСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ

Прэзыдыум ЦСПСБ мабілізаваў 150 рабочых з прадпрыемстваў і 200 служачых савецкіх устаноў для практычнай дапамогі калгасам па ліквідацыі прарываў у асеньняй пасеўнай кампаніі.

Адна, некаторыя прадпрыемствы да гэтага часу ня вылучылі ні аднаго чалавека.

Вось яны гэтыя прадпрыемствы: завод **«Бальшавік», шчотачная ф-ка, завод «Экзэргія», «Эльвод», ф-ка «Камунарка» і друкарня імя Сталіна.**

Выканалі заданьне на 50 проц. завод **«Дрэваапрацоўшчык» і гута «Пралетары.**

Швэйная фабрыка «Кастрычнік» і хэмфармзавод поўнасьцю выканалі свае заданьні.

Савецка-кавапэрацыйныя ўстановы **замест пасылкі 200** супрацоўнікаў у першы дзень вызначылі **толькі 34 чал.**

«Кастрычнік» і хэмфармзавод, якія поўнасьцю выканалі свае заданьні павінны ўзяць па грамадзкі буксір адстаючыя прадпрыемствы і ўстановы.

Пастанова ЦСПСБ павінна быць палкам выканана. **Ц.**

КАРЭНЬНІ АДЛІВУ

У КАМАРЫНСКІМ РАЁНЕ КІРАЎНІЦТВА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯЙ ДАВЕРАНА ПРАВЫМ АПАРТУНІСТЫМ І ПЕРАГІБШЧЫКАМ

КАМАРЫН. (Наш кар.). Становішча калгаснага будаўніцтва ў Камарынскім раёне выклікае сур'ёзную трывогу. Кіраўніцтва калгасамі даверана правым апартуністым, якія тармозяць калектывізацыю ў раёне. Раённыя арганізацыі знаходзяцца ў глыбокім тылу калгаснага руху. **Райвыканком і райкалгасаюз заражаны праваапартуністычнымі, самацёчнымі настроямі.** Калгасы прадастаўлены самі сабе.

Апошняя парада старшынь калгасаў (22 верасьня) паказала, што ў калгасным будаўніцтве ў раёне ёсьць цэлы рад сур'ёзных прарываў. У некаторых калгасах за апошнія 4-5 месяцаў заўважаецца **адліў.** Прычыны адліву раённымі арганізацыямі ня выяўлены і не прааналізаваны. Ня гледзячы на пагражаючае скарачэньне калектывізаванае плошчы, райвыканком і райкалгасаюз нічога ня ўжылі для ўмацаваньня калгаснага будаўніцтва ў раёне.

У маі ў Камарынскім раёне было калектывізавана **28 проц.** бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Зараз гэта лічба паменшылася да **19,8 проц.** У ліпені калгас «Камінтэрн» зусім разваліўся. Раённы камітэт партыі, райвыканком і райкалгасаюз замест усебаковага вывучэньня прычын адліву, замест неадкладнай мабілізацыі ўсіх сіл на ўмацаваньне калгасаў, стараннa замазалі факт развалу гэтага калгасу.

Чаму-ж у раёне ёсьць адліў? Тлумачэньне трэба шукаць у праваапартуністычных і «лявацкіх» скрыўленьнях партыйнае лініі, якія заўважаюцца ў раёне. Раённыя арганізацыі не праводзілі ніякай работы па ўмацаваньні калгасаў. Усё спадзяюцца на самацёк. **У калгасах няма ніякай арганізацыі працы, зусім ня ўведзены нормы выпрацоўкі і правільная аплата працы на аснове прынцыпаў зьдзельшчыны. Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва зусім не разгорнуты.** Не праведзена абагуленьне таварна-грашовае жывёлы на аснове статуту с.-г. арцелі. Усімі гэтымі кардынальнымі пытаньнямі калгаснага руху Камарынскі райкалгасаюз не займаецца. Такое становішча, натуральна, рэзка адбілася на ўборцы ўраджаю, асеньняй сяўбе і збожжазагатоўках.

Да сёнешняга дня ў калгасах ня ўбраны ўраджай. Да ўборкі бульбы яшчэ ня прыступлена. Ня ўбрана звыш 1.000 га скошанай сенажаці. Некаторыя калгасы, напрыклад, **Камарынскі,** дапусьцілі дарэмную пагібель значных пасеваў аўса. Падкрэсьліваем, што раённыя зямельна-кавапэрацыйныя калгасныя органы ня прынялі патрэбных мер для ліквідацыі прарываў ва ўборцы і асеньняй сяўбе.

Разьмеркаваньне ўраджаю і прыбыткаў стаіць на мёртвым пункце. Да гэтага часу толькі ў двух калгасах з 25-ці складзены арыентовачны плян разьмеркаваньня ўраджаю. Няма **ніякай масавай работы** ў сувязі з разьмеркаваньнем. Гэтым карыстаецца кулацтва, якое разгортвае праваакацыйную антыкалгасную агітацыю. Кулакі шалёна папыхаюць чуткі аб пайках, аб тым, што ў калгасьнікаў «адбяруць увесь ураджай». Раённае партыйна-савецкае кіраўніцтва **не мабілізавала** калгасную масу для адпору кулацтву. Кулацкая агітацыя рашучага адпору **не сустракае.**

Адзначаны рэцыдывы перагібаў. Пэўная частка некалгасьнікаў была пакінута без зямлі, каб прымусіць яе ісьці ў калектывы. Да апошняга часу 16 бядняцка-сераднякіх гаспадарак, вынаўшых з калгасу, **не атрымалі** зямлі. Загадчык райзямчасткі РВК **РАГАЧОЎ** заяўляе:

— Зямлі не атрымліваюць тыя, хто выходзіць з калгасу. Яны самі вінаваты ў гэтым. Калі-б яны засталіся ў калгасе, дык мелі-б зямлю. (!)

Масавая палітычная работа ў калгасах заняпала. Раённыя арганізацыі не праводзяць ніякіх масавых мерапрыемстваў і зусім не займаюцца палітычным выхаваньнем калгасьнікаў. Са студзеня па верасень праведзена ўсяго толькі адна парада старшынь калгасаў. Ні адна канфэрэнцыя калгасьнікаў у раёне ня была арганізавана.

Паасобныя кіраўнікі раёну, напрыклад, член бюро РК КП(б)Б **Робэрман,** займаюць праваапартуністычную пазыцыю ў пытаньнях работы сярод беднаты. Робэрман, напрыклад, адмаўляе патрэбнасьць правядзеньня работы па самастойнай арганізацыі батрацка-бядняцкіх мас. Райком ня даў адпору такім праваапартуністычным настроям.

З усіх гэтых фактаў добра відаць, што прычыны адліву заключаюцца, прыкладна, у наступным: а) у адсутнасьці ўсякай работы па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў, у тым, што ў калгасах Камарынскага раёну няма ніякай арганізацыі працы; б) у паўтарэньні «лявацкіх» перагібаў і скрыўленьняў партыйнае лініі ў адносінах да адзінаасобных бядняцка-сераднякіх гаспадарак; в) у прымірэнчых адносінах раённых арганізацый да падрыўной дзейнасьці кулацтва, у тым, што кулацкая антыкалгасная агітацыя не сустракае своячасовага і жорсткага адпору. Усё гэта зьяўляецца лёгічным вынікам **праваапартуністычнай стаўкі на самацёк,** пад уладу якога цалкам і поўнасьцю падпалі раённыя ўстановы.

Трэба зараз-жа адхіліць ад кіраўніцтва калгасным рухам у раёне правых апартуністых і «левакоў». Кіраўніцтва Камарынскага раёну павінна быць рашуча **АБНОЎЛЕНА. Партыйны абавязак Камарынскай арганізацыі КП(б)Б заключаецца ў тым, каб бязьлітасна змагаючыся з правым апартунізмам і рэцыдывамі «левых» перагібаў,** замацаваць калгасы і забясьпечыць **СЫСТЭМАТЫЧНЫ КАЛГАСНЫ ПРЫЛІЎ.**

К-у.

Усяго 20 проц. пляну

ЦЕРАХАЎКА. (Наш кар.). Асеньняя сяўба ў **Церахаўскім** раёне прахоўзіць слаба. На сёнешні дзень калгасы выкналі пасеўны плян толькі на **20 проц.** індывідуальны сэктар — на 60 проц. У радзе калгасаў уборка ўраджаю яшчэ ня скончана. Калгасы да гэтага часу ня ўбралі 250 га аўсу, 300 га грэчкі і 300 гэктараў сенажаці. Адставаньне калгасаў ва ўборцы ўраджаю і асеньняй сяўбе тлумачыцца зусім кепскай арганізацыяй працы і нездавальняючай праводнай дысцыпліны сярод калгасьнікаў.

Плян ачысткі насеньня выкананы толькі на **58 проц.** С.-г. машыны скарыстоўваюцца **агідна.** Шмат якія сельсаветы не выкарыстоўваюць раданых сялярак і іншых с.-г. машын. На складах райкалгасаюзу валяюцца мёртвым грузам сартоўкі, малатарні, бароны і сячкарні, у той час, калі калгасы адчуваюць вялізарную патрэбу ў гэтых машынах.

У раёне літаральна нічога ня зроблена па арганізацыі калгаснага прыліву. Калгасы адгарадзіліся сьцяной ад адзінаасобнікаў. Ні адзін калгас яшчэ не арганізаваў справаздачы.

С. ЛОДЫСЕУ.

Сусьветны крызіс капіталізму паглыбляецца

ЭКАНАМІЧНЫ КРЫЗІС У АНГЛІІ

ЛЁНДАН, 26. Гэтымі днямі апублікаваны ў органе міністэрства працы афіцыйныя даныя аб эканамічным становішчы Англіі. Даныя гэтыя паказваюць, наколькі заўчасным былі прадказаньні буржуазных эканамістых аб надыходзячым нібы ўвосеньні паляпшэньні эканамічнага становішча.

За жнівень **здобыча вугалю** склала 16,9 мільёнаў тон замест 16,6 млн., але гэтае невялікае павялічэньне тлумачыцца толькі сэзоннымі хістаньнямі. У жніўні 1929 году вугалю было здабыта па паўтары мільёны тон больш. Экспарт вугалю ў жніўні бягучага году складаў 6,7 млн. тон замест 6,3 млн. тон у ліпені і 6,9 млн. у жніўні мінулага году.

Чыгуну ў жніўні было выплаўлена 416,7 тыс. тон, замест 486,1 тыс. тон у ліпені і 682.000 тон у жніўні мінулага году. У жніўні працавала 104 доменныя печы, г. зн. на 36 менш, чым у жніўні 1929 году.

У канцы жніўня працавала ўсяго 371 заводы па выпрацоўцы **белай бляхі і літой сталі,** замест 387 у ліпені і 400 у жніўні мінулага году. Гальванізаванай і ліставой сталі ў жніўні было вывезена 58,981 тона, або на 33.500 тон менш, чым у ліпені і на 41.207 менш, чым у жніўні мінулага году. Агульная выплаўка сталі ў жніўні раўнялася 451,3 тыс. тон замест 621,4 тыс. тон у ліпені і 753,3 тыс. тон у жніўні мінулага году.

Бавоўны ў жніўні было вывезена 42,9 млн. фунт., што складае невялікае павялічэньне ў 4,3 мільёнаў фунт. параўнальна з ліпенем. Павялічэньне тлумачыцца рэакцыі ажыжэньнем цэн. Але параўнальна са жнівенем 1929 году вымяншэньне складае 17,3 млн. фунт. **Бавоўнянай пражы** ў жніўні было вывезена 10,2 млн. фунт., замест 10,4 млн. у ліпені і 15,3 млн. у жніўні мінулага году. **Вывяз шарсьцяных тканін** у жніўні складаў 3,1 млн. фунт., замест 3,2 млн. у ліпені і 4,9 млн. у жніўні 1929 году.

Рэзкае скарачэньне вытворчасьці разам з рацыяналізацыяй выклікала вялізарны рост беспрацоўя. Паводле даных міністэрства працы, беспрацоўе сярод рабочых мэталістых вырасла параўнальна з ліпенем ад 4 да 9 проц., дасягнуўшы ў некаторых галінах 37 проц. Сярод гарнякоў беспрацоўе параўнальна з ліпенем павялічылася на 4,6 проц., дасягнуўшы 23,6 проц. Сярод тэкстыльшчыкаў беспрацоўных 46,%.

Эканамічны крызіс вельмі выявіўся на ажыжэньні курсаў акцый і каштоўных папер. Паводле вылічэньняў «Файнншэль Ньюс», калі індэкс за 1928 год прыняць за 100, дык у сьнежні 1929 году агульны курсавы індэкс быў ужо 86,6, а ў жніўні 1930 году — 72,6. У цяперашні момант, пасьля біржавых маніпуляцый, якія паднялі індэкс да 81, наглядаецца новае зьніжэньне да 77,4. (ТАСС).

„Мы ў крызіс толькі ўступаем"

ПРАМОВА ЛЁЙД-ДЖОРДЖА АБ ЭКАНАМІЧНЫМ СТАНОВІШЧЫ АНГЛІІ

ЛЁНДАН. Абараняючы ў апошняй прамове ў Стоўмаркеце сваю палітыку супрацоўніцтва з «рабочай» партыяй, Лёйд-Джордж палічыў патрэбным зьвярнуць увагу ангельскай грамадзкай думкі на вельмі сур'ёзны характар эканамічнага крызісу, які перажывае Англія.

«Ад часу самых змрочных дзён сусьветнай вайны мы нічога падобнага не перажывалі, — заявіў ён, — лічба беспрацоўных расьце кожны тыдзень не батальёнамі, а цэлымі дывізіямі, і я ня бачу канца гэтаму. У цяперашні момант мы знаходзімся не ў сярэдзіне крызісу, а **толькі ўступаем у яго.** Гэтае асаблівае становішча патрабуе многа адвагі і адольнасьці, уменьня глядзець на рэчы так, як яны ёсьць. Нам прыходзіцца цяпер думаць не аб інтарэсах тых людзей, якія хочуць трымаць у сваіх руках абмежаваны рынак для буйных прыбыткаў, а аб лёсе нашага 45-мільённага народу».

Гіранізуючы далей над прапановамі кансэрватараў аб ператварэньні Вялікабрытаніі ў ізаляваную эканамічную адзінку, Лёйд-Джордж закончыў: «Гэта ня значыць, што трэба хватацца за ўсякую бессэнсоўную і скорасьпелую прапанову. Гаворыць, што чалавек, які топіцца, хапаецца за саломінку. Але бывае і так, што згарача ўхопішся за аклу і яна моцна ўкусіць».

ПАГАРШЭНЬНЕ ЖЫЦЬЦЁВАГА ЎЗРОЎНЮ АНГЕЛЬСКІХ РАБОЧЫХ

ЛЁНДАН, 25. Паводле даных «Весьніка міністэрства працы», зарплата рабочых у Англіі зьменшылася з 1-га чэрвеня 1929 году на 100.000 ф. стэрлінгаў у месяц, што адпавядае вымяншэньню зарплаты кожнага работніка ў сярэднім на тры пэнса на тыдзень. Паводле тых-жа даных, кошт жыцьця ў Англіі на 1-га верасьня 1930 году быў на 57 проц. вышэй, чым у 1913 годзе. (ТАСС).

Хваля белага тэрору заліває Польшчу

Галадоўка палітвязьняў у Беластоцкай турме

Манархічнае віленскае «Слова» паведамляе аб галадоўцы палітвязьняў у Беластоцкай турме. Галадае некалькі сот палітвязьняў ужо дзесяты дзень. Да галадуючых ужываецца ШТУЧНАЕ КАРМЛЕНЬНЕ, якое суправаджаецца трагічнымі сцэнамі. ЁСЬЦЬ ВЕСТКІ, ШТО НЕКАЛЬКІ ГАЛАДУЮЧЫХ УЖО ПАМЁРЛА.

Перад будынкам турмы ўвесь час знаходзіцца вялікі натоўп з сваякоў палітзьняволеных, а таксама з рабочых мясцовых фабрык і заводаў. Турма акружана значным атрадам пешай і конай паліцыі, які разганяе і не дапускае натоўп да турмы.

З першых-жа дзён габінэту маршала Пілсудзкага-Палкіна па ўсёй Польшчы бязупынна адбываюцца ВОБЫСКІ, АРЫШТЫ, АБЛАВЫ. Тысячы лепшых прадстаўнікоў рабочае клясы і працоўнага сялянства кінуты ў турмы. ЗАРАЗ КАРНЫЯ АТРАДЫ З ПАЛІЦЫІ і ВОЙСКА «НАВОДЗЯЦЬ ПАРАДАК» У ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЕ. ЦЭЛЫЯ ВОЛАСЬЦІ СЯЛЯН У ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЕ, ПАКІНУЎШЫ СВАЕ ДАМЫ І ДАБРО, ПАЎЦЯКАЛІ Ў ЛЯСЫ. Адначасова з гэтым у ЛЮБЛІНЕ ЗНОЎ ВЫНЕСЕНЫ ПРЫГАВАР КАРЫ СЬМЕРЦЮ ПРАЗ ПАВЕШАНЬНЕ ДЛЯ 3 РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ РАБОЧЫХ САСНОЎЦА, НЯБЕСКАВА І КАГАНА. Адным словам, ХВАЛЯ ТЭРОРУ ЗАЛІВАЕ ЎСЮ ПОЛЬШЧУ. Пілсудзкі энэргічна падрыхтоўвае тылы і пляцдарм для будучай вайны з СССР з мэтаю захопу Савецкай Беларусі і Савецкай Украіны.

Узмацняецца тэрор і ў турмах. За апошні толькі тыдзень АДБЫЛІСЯ ГАЛАДОЎКІ Ў КРАСНАСТАЎСКАЙ ТУРМЕ, У ЖЭШОВЕ І ЗАРАЗ У БЕЛАСТОЦКАЙ ТУРМЕ. Галоўнае, чаго дабіваюцца палітвязьні — гэта ДАПУШЧЭНЬНЕ ХАРЧОЎ З ДОМУ АД СВАЯКОЎ, ДАПУШЧЭНЬНЕ Ў ТУРМЫ КНІЖАК І ГАЗЭТ І ПРЫСЬПЯШЭНЬНЕ СЬЛЕДЗТВА, ЯКОЕ ЦЯГНЕЦЦА ГАДАМІ.

Па загаду вышэйшых улад турэмныя каты робяць усе намаганьні, каб ФІЗЫЧНА ЗЬНІШЧЫЦЬ лепшых прадстаўнікоў рэвалюцыйных рабочых і сялян, кінутых у турмы, абязьлічыць іх, выбіць з іх чалавечае пачуцьцё, зрабіць іх панскім паслухмяным быдлам. Зараз па загаду вышэйшых улад турэмныя каты прысьпяшаюць тэмпы па фабрыкацыі «чырвоных трупаў».

Асабліва вядома сваім жахлівым рэжымам БЕЛАСТОЦКАЯ турма, у якой адбываюць пакараньні пераважна рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі. Гэта турма па сваім рэжыме лічыцца аднэй з самых жахлівых ва ўсёй фашысцкай Польшчы. І ня дзіва. Турэмны пэрсанал, асабліва вышэйшы, складаецца з былых турэмшчыкаў катаржных царскіх турмаў, а таксама з рускіх белагвардзейцаў — сынкоў былых памешчыкаў, губернатараў, як ВАТАЦЫ і інш. Пракурорам-жа акруговага суду ў Беластоку зьяўляецца нейкі ЗУБЯЛЕВІЧ, б. царскі пракурор Кіеўскага акруговага суду, памешчык. І вось гэта белагвардзейская сволач і б. царскія охраньнікі пакладаюць усе свае сілы на тое, каб тут, у турэмных мурох расправіцца з ненавіснымі ім рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі, канчаткова пакончыць з імі. РЭПРЭСІІ ў адносінах да палітвязьняў, ПРАВАКАЦЫІ розных скандалаў з мэтаю выкінаць канфлікт, каб мець прычыну для жорсткай расправы над нянавіснымі ворагам — палітвязьнямі— АМАЛЬ ШТОДЗЕННАЕ ЗЬЯВІШЧА Ў ГЭТАЙ ТУРМЕ. Таму нядзіва, што Ў ГЭТАЙ ТУРМЕ КОЖНЫ ГОД БЫВАЕ ПА НЕКАЛЬКІ ГАЛАДОВАК, А Ў 1923 ГОДЗЕ НА ПРАЦЯГУ 8 МЕСЯЦАЎ БЫЛО аж 7 галадовак палітвязьняў, прычым у часе апошняй галадоўкі ў жніўні месяцы пад час штучнага кармленьня БЫЛО ЗАДУШАНА 8 ПАЛІТВЯЗЬНЯЎ. І зараз, як падае «Слово», ёсьць весткі, што сяро галадуючых, якіх таксама штучна кормяць, некалькі чалавек памерла, правільней — ЗАДУШАНА. Белагвардзейская сволач і каты царскіх турмаў аб гэтым пастараліся.

Лютуе фашысцкі тэрор па ўсім краі і ў турмах. УСЯ ПОЛЬШЧА НАГАДВАЕ ЗАРАЗ АДНУ АГУЛЬНУЮ ТУРМУ, ВЫНОСЯЦЦА ПРЫГАВАРЫ КАРЫ СЬМЕРЦЮ ПРАЗ ПАВЕШАНЬНЕ РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ РАБОЧЫМ, ФІЗЫЧНА ЗЬНІШЧАЮЦЦА ЛЕПШЫЯ БАРАЦЬБІТЫ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ І ПРАЦОЎНАГА СЯЛЯНСТВА Ў ТУРМАХ.

ПРАЦОЎНЫЯ ЎСЯГО СЬВЕТУ ПАВІННЫ ЎЗЬНЯЦЬ СВОЙ РАШУЧЫ ГОЛАС ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКАГА ТЭРОРУ Ў ПОЛЬШЧЫ, СУПРОЦЬ ЖАХЛІВЫХ УМОЎ Ў КАМЕННЫХ МЯШКОХ — ТУРМАХ, СУПРОЦЬ НОВЫХ ПРЫГАВАРАЎ КАРЫ СЬМЕРЦЮ ПРАЗ ПАВЕШАНЬНЕ НАД РЭВАЛЮЦЫЙНЫМІ РАБОЧЫМІ.

С. Ж.

Паўмільёна дзяцей бяз школы

Польскі буржуазны друк падае, што ў бягучым 1930-31 навучальным годзе ў Польшчы налічваецца 4.240.000 дзяцей школьнага ўзросту. У мінулым годзе дзяцей у школьным узросьце было 3.900.000, адгэтуль прырост складае 340.000 чал.

Для навучаньня ўсіх гэтых дзяцей фашысцкая Польшча ня мае ня толькі адпаведных памяшканьняў, але адчуваецца нават недахват у настаўніках. Калі самаўрады і знойдуць пэўную колькасьць памяшканьняў над школы, дык усё роўна іх ня хопіць, каб ахапіць вучобаю ўсіх дзяцей школьнага ўзросту. А між тым фашысцкі ўрад у сваім бюджэце вызначыў на школьнае будаўніцтва толькі 7,5 мільёнаў злотых, у той час, як для гэтай мэты патрэбна, нават паводле вылічэньняў самога ўраду, ня менш 150 мільёнаў злотых. Але нават і гэтых мізэрных сродкаў, ужо асыгнаваных, урад не выдае э-за чаго спынена ўжо распачатае будаўніцтва школ.

Акрамя недахвату школьных будынкаў, не хапае і настаўнікаў. Для ахопу навучаньнем усіх дзяцей школьнага ўзросту ў Польшчы, акрамя існуючых, патрэбна яшчэ 8.500 штатных настаўніцкіх адзінак. Між тым урад асыгнаваў сродкі толькі на 500 штатных адзінак. І вось, калі прыняць, што на аднаго настаўніка ў Польшчы прыпадае ў сярэднім 60 вучняў, дык выходзіць, што паўмільёна дзяцей у фашысцкай Польшчы застаецца ў гэтым годзе па-за школаю.

З прычыны недахвату школ у Варшаве ля школьных будынкаў адбываюцца проста незвычайныя сцэны. Так падае «Газэта Варшаўска», пагрозы бацькоў з вучнямі ходзяць ад школы да школы, праклінаючы «незалежную» бацькаўшчыну.

Далей газэта піша: «Школы пераапоўнены. На аднаго настаўніка прыпадае 70-80 вучняў. Аб нармальным навучаньні ня можа быць і гутарні. Празьмерная колькасьць кляс, якія ня маюць настаўнікаў, выклікаюць тое, што дзеці вучацца толькі па 2 гадзіны ў дзень».

Такім чынам, палітыка фашысцкага ўраду, які мільярды траціць на падрыхтоўку ўзброенага нападу на СССР, бядае ня толькі да жабрацтва і галечы працоўных мас, але і да ўзросту з кожным годам народнае цэмры.

Вобыск у рэдакцыі „Палёнія"

ВАРШАВА, 27. Паведамленьне газэт аб адпраўцы арыштаванага дэпутата, лідэра хрысьціянскіх дэмакратаў, Карфанты ў Брэсцкую крэпасьць, аказалася не дакладным. У апазыцыйных колах цыркулюць чуткі, што Карфанты адпраўлен у адну з страшных турмаў «Сьвяты крыж», рэжым якой у свой час ня раз даваў повад да запытаньняў у сойме, у сувязі з масавай сьмяротнасьцю зьняволеных у гэтай турме камуністых.

У рэдакцыі органу Карфантага, «Палёнія» зроблен вобыск. Афіцыёз «Газэта Польска» заяўляе, што Карфанты імкнуўся да адарваньня Верхняй Сілезіі ад Польшчы і стварэньня з яе аўтаномнай обласьці. Гэта абвінавачаньне тым больш характэрна, што на падставе Вэрсальскага дагавору Верхняя Сілезія павінны карыстацца аўтаноміяй. (ТАСС)

Фашысцкі тэрор у Заходняй Украіне

ВАРШАВА, 27. У Варшаве ў саюзе сацыялістычнай моладзі «Паходня» паліцыяй зроблен вобыск. Арыштаваны 4 члены саюзу. У паліцэйскім паведамленьні гаворыцца, што саюз зьяўляецца агентурай кампартыі.

У Драгамыскім павеце закрыта 11 бібліятэк украінскага культурнага асьветнага таварыства «Просьвіта». Вобыскі і арышты робяцца ў радзе іншых украінскіх культурна асьветных арганізацый. На Валыні наглядаецца рост сялянскага руху. За апошні дзень у шмат якіх пунктах Валынскага ваяводзтва зарэгістраваны рад падпалаў панскіх маёнткаў. У Далубнове спалены паравы млын. Згарэлі вялізарныя запасы хлеба. (ТАСС)

Дэманстрацыя Англіі ў Міжземным моры

ПАДРЫХТОЎКА ДА НАПАДУ НА СССР

ВЕНА, 24. Паводле паведамленьняў з Атэн, грэцкае міністэрства замежных спраў атрымала ад ангельскага ўраду паведамленьне, што ў кастрычніку ў грэцкія гавані прыбудуць ангельскія ваенныя судны. У Фаліно (паблізу Атэн) прыбудзе адзін браненосец і тры іншых ваенных судна. У Корфу прыбудзе 5 браненосцаў і 39 іншых адзінак ангельскага флёту. У Судас прыбудзе два ваенных караблі і 6 падводных лодак. На выспу Спэфа прыбудзе эскадра падводных лодак. Падыходзячыя морскія дэманстрацыі Англіі ў Міжземным, Эгейскім і Іанійскім марох расцэньваецца, як падрыхтоўка да прасоўваньня ангельскага флёту ў Міжземнае мора ў выпадку вайны з СССР.

Англія імкнецца ўцягнуць Нямеччыну ў ант

Ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі—частка агульнага сацыялістычнага наступленьня

АПАРТУНІСТЫЯ ЗАТРЫМЛІВАЮЦЬ

ТЭМПЫ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ, ІГНАРУЮЦЬ РАБОТУ СЯРОД ПРАЦОЎНЫХ НАЦМЕНШАСЬЦЯЙ

Толькі перамагаючы яўныя і скрытыя элемэнты вялікадзяржаўнага і мясцовага шавінізмаў, пасьлядоўна праводзячы ленінскую нацыянальную палітыку—магчыма вырашыць пытаньні нацыянальных пралетарскіх кадраў, уцягнуць у будаўніцтва сацыялізму шматнацыянальныя працоўныя масы

Руйнуючы агонь

па тых, хто тармозіць бальшавіцкае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі

Месячнік беларусізацыі, які праводзіцца зараз у некаторых раёнах, выяўляе з боку некаторых арганізацый, ячэек апартуністычную недаацэнку правядзеньня беларусізацыі, работы сярод працоўных нацменшасьцяй. «ПРЫМАЮЧЫ ПАД УВАГУ ТЭМПЫ, НЯМА СЭНСУ ЗАЙМАЦЦА НАЦПАЛІТЫКАЙ»—вось думкі некаторых камуністых з Магілеўскай швэйнай фабрык. І такія «думкі» пашыраны.

Па носьбітах такіх апартуністычных настрояў і дзеяньняў трэба біць і біць моцна і бязьлітасна.

Партыя ніколі не ставіла пытаньня нацыянальнай палітыкі адарвана ад усёй агульнай барацьбы за дыктатуру пралетарыяту. Ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі зьяўляецца арганічнай часткай усяго агульнага сацыялістычнага наступленьня.

Рэканструкцыйны пэрыяд патрабуе ЯШЧЭ БОЛЬШАЙ АКТЫВІЗАЦЫІ ў правядзеньні нацыянальнай палітыкі, ЯШЧЭ БОЛЬШАГА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ барацьбы з тымі, хто тармозіць яе правядзеньне.

МЫ ПАВІННЫ ЎЗМАЦНІЦЬ ТЭМПЫ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ, БО БЯЗ ГЭТАГА НЕМАГЧЫМА ЎЦЯГНУЦЬ ВА ЎДЗЕЛ У САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ ВЯЛІЗАРНЫЯ МАСЫ ПРАЦОЎНЫХ ШМАТЛІКІХ НАЦЫЯНАЛЬНАСЬЦЯЙ.

Мы павінны ўзмацніць барацьбу з шавінізмамі, беларускім, яўрэйскім і інш., накіроўваючы галоўны агонь на барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам — галоўнай небясьпекай. Бяз гэтай барацьбы немагчыма вырашыць пытаньні нацыянальных пралетарскіх кадраў, кіруючых кадраў з карэннага насельніцтва Беларусі, бяз гэтай барацьбы немагчыма прыцягнуць да сацыялістычнага будаўніцтва шматнацыянальныя працоўныя масы.

Хто гэтага не разумее, той адступае з фронту нашага сацыялістычнага наступленьня. Хто ігнаруе і скажае прынцыпы ленінскай нацыянальнай палітыкі, той зьяўляецца яўным апартуністым.

Толькі так ставіцца пытаньне. Толькі такія вывады трэба зрабіць з ніжэй зьмешчаных адмоўных фактаў нашым партыйным і прафсаюзным арганізацыям.

Руйнуючы агонь па тых, хто тармозіць бальшавіцкае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі!

ГАДАВІНА ЦЯГАНІНЫ

Ворах папер... На паперах нумары, даты, штампы і подпісы.

Дзеля палягчэньня арыентыроўкі ў папяровых справах разьмяркуем іх на тры групы. Да першай аднясем пматлікія пастановы савецкіх і партыйных органаў, якія і засталіся пакуль толькі пастановамі, не знайшоўшы на працягу году практычнага ажыцьцяўленьня. Да другой—тыя дакуманты, якія характарызуюць бюракратычнае супраціўленьне адказных работнікаў з ЦСПСБ і рвацтва праўленьня клюбу харчавікоў. Да трэцяй—апэляцыі арганізацыйнай камісіі клюбу нацменшасьцяй.

Год таму назад інспэктарам літкультуры пры НКА т. Жольпэ было ўзьнята пытаньне перад адпаведнымі савецкімі органамі аб арганізацыі ў Менску клюбу для культурнага абслугоўваньня літоўскіх і латыскіх нацменшасьцяй. Гэтую ініцыятыву падтрымала нацкамісія ЦВК і запрапанавала менскаму гарсавету прадаставіць адпаведнае памяшканьне. Гарсавет чамусьці не адважыўся на самастойнае вырашэньне гэтага пытаньня, а перанёс яго ў акругком. Акругком прапанаваў фракцыі гарсавету прадаставіць над клюб нацменшасьцяй памяшканьне былога клюбу харчавікоў. Гарсавет выраішае пытаньне ў станоўчым сэнсе. Адкрыцьцё літоўска-латвійскага клюбу прыстасоўвалася да дня 10 гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў.

Але калі арганізацыйная камісія клюбу нацменшасьцяй зрабіла вопіс маемасьці і прыём прызначанага памяшканьня, адказны сакратар ЦСПСБ тав. Аверын запрапанаваў і самаўпэўнена заявіў:

— Памяшканьне наша і нікому мы яго не аддамо.

Сказана, зроблена. Тав. Аверын аддае загад вартаўніку памяшканьня нікога ня ўпускаць бяз пропуску камэнданта ЦСПСБ. Перагаворы арткамісіі з т. Аверыным не далі ніякіх вынікаў. Тав. Рыжоў зусім адмовіўся гаварыць па гэтым пытаньні, абмежаваўся заявай, што «нітхо ня мае права распараджацца нашымі клюбамі».

У гарачцы спрэчак аб «праве» на памяшканьне, адказныя работнікі ЦСПСБ зусім забыліся аб праве тысячы рабочых літоўцаў і латышоў, якія знаходзяцца ў Менску, мець памяшканьне для культурна-асьветнай работы на іх роднай мове. Выпалі з-пад увагі кіраўніцтва ЦСПСБ і адпаведныя па гэтым пытаньні дырэктывы партыі.

Тав. Аверын дабіваецца паўторнай пастаноўкі пытаньня аб памяшканьні ў акругкоме і вырашэньня яго ў пажаданым для Аверына напрамку. Бюро АК КП(б)Б пастановай ад 2 ліпеня г. г. замацоўвае памяшканьне за ЦСПСБ і адначасова прапануе фракцыям ЦСПСБ і АВК прадставіць над клюб нацменшасьцяй раўназначнае памяшканьне.

Ранейшая пастанова АК аб памяшканьні клюбу харчавікоў была скасавана толькі таму, што т. Аверын запэўніў бюро Акругкому ў тым, што памяшканьне для клюбу нацменшасьцяй ЦСПСБ прадаставіць у бліжэйшы час. На справе-ж аказалася, што т. Аверын толькі «дыплёматнічаў». Ён накіраваў арткамісію ў праўленьне клюбу харчавікоў для перагавораў аб прадастаўленьні літоўска-латыскай сэкцыі аднаго пакою ў новым памяшканьні клюбу. Перагаворы з боку праўленьня клюбу харчавікоў, якія праходзілі пры ўдзеле старшыні ЦП саюзу т. Тарасевіча, абярнуліся ў камэрцыйнае гандлярства. Праўленьне клюбу згадзілася прадаставіць адзін пакой (з плошчай прыблізна каля 3 кв. мэтраў) за плату па 1000 руб. за месяц. 1.000 руб.!—больш чым 300 руб. за кв. мэтр. Сапраўды трэба галаву мець, здольную толькі шапку пасіць, каб дайсьці да такой прапановы.

Работнікі ЦСПСБ, якія запэўнялі акругком, што памяшканьне будзе прадастаўлена, засталіся «нэйтральнымі» ў гэтай справе.

У гэты-ж час загадчык домам Камасьветы т. Лінг у сваю чаргу афіцыйнай адносінай ад 19 жніўня, «абгрунтаваўшы» размах сваёй работы на зімовы час, прапануе латсэкцыі «аслабаніць да і верасьня пакой», які яна займала ў доме Камасьветы і па ўсіх правілах канцылярская кручкатворства папяроджвае «ў праціўным выпадку» і г. д.

Усе імкненьні і жаданьні таварышоў арганізаваць клюб, ці атрымаць пакой для лепшай пастаноўкі культурнага абслугоўваньня нацменшасьцяй, засталіся бяз вынікаў.

Праўда ёсьць вынікі ў другім сэнсе—гэта гадавіна цяганіны і бюракратызму.

Галоўная заслуга гэтай «урачыстасьці» за адказнымі работнікамі ПСПСБ і другародным—за «культурнікамі» клюбу харчавікоў.

Я. ІВАШЫН.

На барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам!

Работа сярод нацменшасьцяй на закутках

— Ня шукайце ў нас беларусізацыі, бо дэкрэтаў з цэнтру ня было,—так заявіў загадчык канторы таварнай ст. Менск, галі ў яго запыталіся пра вынікі правядзеньня месячніка беларусізацыі.

— З беларускай мовай толькі да Смаленску даедзеш—такая думка гаспаўсюджана ў аднэй брыгадзе чыгуначнікаў.

Хто дае адпор такім вялікадзяржаўным настроям і дзеяньням?Ніхто.

Сыгналаў аб правах вялікадзяржаўнага шавінізму, аб прарывах у правядзеньні беларусізацыі сярод чыгуначнікаў было даволі ў нашым друку. Але гэтыя сыгналы для парт'ячэйкі МВБ, мясцовых прафарганізацый засталіся пустым гукам.

Месячнік беларусізацыі па Кастрычніцкім раёне выявіў цэлы рад канкрэтных носьбітаў вялікадзяржаўнага шавінізму.

Так, у Наркамфіне мы мелі вылазку вялікадзяржаўных шавіністых—членаў рэдкалегіі пасьценгазэты, якія на сходзе катэгарычна даводзілі аб неабходнасьці выдаваць газэту толькі на расійскай мове.

— Расійская—усім зразумелая мова. —Вось іх «аргумэнт».

Мы маем такое зьявішча, калі і па сёнешні дзень нераважная большасьць работнікаў МЦРК катэгарычна адмаўляецца ад правядзеньня беларусізацыі.

Партыйныя ячэйкі павінны стаць на чало сапраўднага кіраўніцтва мабілізацыяй мас на барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам, не паслабляючы, а ўзмацняючы барацьбу з іншымі шавінізмамі; стаць на чале бальшавіцкага правядзеньня беларусізацыі ў жыцьцё.

Месячнік яшчэ не разгарнуў масавай, шырокай кампаніі па растлумачэньні прынцыпаў ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Факт недаацэнкі работы сярод нацменшасьцяй з боку некаторых ячэек, паасобных камуністых гаворыць аб неабходнасьці барацьбы з такім адпабаковым разуменьнем задач месячніка.

Месячнік беларусізацыі павінен стаць на чалавечнае узмацненьня работы сярод нацменшасьцяй.

Кастрычніцкі РК КП(б)Б павінен працягнуць тэрмін месячніку.

АКЦЯБРСКІ.

НА ЧАЛЕ КАЛГАСНАГА РУХУ

Парт'ячэйкі калгасаў, вучэцеся ў радзееўцаў бальшавіцкім тэмпам работы!

Калгас імя Энгельса параўнальна, малады: ён арганізаваўся ў часе бальшавіцкай вясны. Радзееўская ячэйка стала на чале калгаснай хвалі бядняцка-серадняцкіх мас. У жорсткай непрымірымай клясавай барацьбе з кулаком, выкліканай суцэльнай калектывізацыяй сельсавету, расла і мацнела партыйная ячэйка. За 6 месяцаў сваёй работы парт'ячэйка калгасу вырасла ў 7 разоў. Яна цяпер у сваіх радох налічвае 35 чал. —10 чэнаў і 25 кандыдатаў. Напярэдадні XIII і XVI зьезду у ячэйку падана 14 заяў аб прыёме ў рады КП(б)В. Ячэйка расьце за лік батрацка-бядняцкіх мас, — тых мас, ярасьць і актыўнасьць якіх была мабілізавана на барацьбу з клясавым ворагам, на ліквідацыю кулацтва, як клясы, і правядзеньне калектывізацыі. У калгасе імя Энгельса цяпер можна налічыць не адзін дзесятак беспартыйных актывістых — беднякоў і сераднякоў, арганізатараў калгасаў у аколічных вёсках, брыгадзіраў. Партыйная ячэйка здолела арганізаваць гэты актыў. Актыў згуртаваўся навакол парт'ячэйкі, яго рады з кожным днём усё павялічваюцца.

Парт'ячэйка зрабілася штабам кіраўніцтва калгасу, сапраўдным кіраўніком калгаснага жыцьця, яна сваячасова перабудавала свае рады, павярнулася тварам да пытаньняў унутрыкалгаснага жыцьця, сваёй бальшавіцкай работай дабілася вялікіх посьпехаў у справе замацаваньня і разьвіцьця калгасу Энгельса. Калгас імя Энгельса зьяўляецца ўзорам усяе Гомельшчыны. Ён абярнуўся ў магутны гаспадарчы арганізм і зьяўляецца лепшым агітатарам за калектывізацыю ва Ўвяравіцкім і Буда-Кашалёўскім раёнах.

Два месяцы ўпартай работы і барацьбы за калгас далі свае вынікі: калгас вырас і замацаваўся. Зараз калгас імя Энгельса яднае **256 гаспадарак** (батрацкіх 11, бядняцкіх 80, серадняцкіх 165) з плошчай **зямлі 2.500 га.**

З першых дзён арганізацыі калгасу радзееўскія камуністы ўпарта змагаліся за арганізацыйнае і гаспадарчае замацаваньне калгасу. Пры самой арганізацыі калгасу і пасьля, ячэйка правяла дзесяткі сходаў беднаты і актыву вёскі, узьмяжоўчы масы беднаты і сераднякоў — калгасьнікаў на падрыхтоўку да веснавой пасоўнай кампаніі.

Напярэдадні веснавой сяўбы (сакавік) парт'ячэйка, сумесна з праўленьнем калгасу, шырока абгаварыла пытаньне арганізацыі працы ў калгасе. З пачатку былі арганізаваны вытворчыя нарады (6 нарад), якія ў сваю чаргу над кіраўніцтвам ячэйкі (там працавалі камуністы), зразумелі важнасьць пытаньня арганізацыі працы. Пасьля шырокага абгаварэньня гэтага пытаньня сярод калгасьнікаў, была прынята 7-разрадная тарыфная сетка, па якой суадносіны паміж 1 і 7 разрадамі складаюць, як 1:3 (1 разрад атрымлівае 65 кап., а 7—2 руб.).

У калгасе ўведзена зьдзельшчына. Кожнаму калгасьніку даецца цьцёрдае заданьне.

Арганізацыя работы ў калгасе была галоўнай умовай як арганізацыйнага, так і гаспадарчага замацаваньня калгасу.

Клясавы вораг — кулак, адчуваючы сваю няминучую сьмерць, аказваў шалёнае супраціўленьне. Але радзееўскія камуністы, разам з уваравіцкім райкомам партыі, сваячасова здолелі арганізаваць батрацка-бядняцкія масы на барацьбу з азьвярэлым кулаком. Ярасьць і актыўнасьць беднаты была мабілізавана супроць кулака і варожага элемэнта, які пралез у калгас.

Веснавая пасоўная кампанія праведзена з вялікім посьпехам. Мэтадамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва Радзееўская парт'ячэйка дабілася таго, што веснавая сяўба была скончана за тыдзень да тэрміну, з перавышэньнем пляна на 25 проц.

Уборку ўраджаю, як і веснавую сяўбу, калгасьнікі правялі па-бявому. Пад кіраўніцтвам ячэйкі калгасьнікі адразу, пасьля сканчэньня веснавой сяўбы, за месяц да ўборкі, пераключыліся на бявое правядзеньне падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі. Пры самой уборцы калгасьнікамі была ўлічана практыка вясны. Уся рабочая сіла была разьбіта на 9 ударных брыгад. Кожны загадзя ведаў сваю работу.

У пачатку ўборкі ад ударніцтва і сацыялістычнага спаборніцтва паміж асобнымі брыгадамі ўвесь калгас імя Энгельса перайшоў на ўдарныя тэмпы работы. Калгас абвясьціў сябе ўдарным. Усе калгасьнікі і калгасьніцы на ўвесь час уборкі адмовіліся ад выхадных дзён, на палёх калгасу працавала 700 ударнікаў.

Увесь ураджай азімых — 383 га — якія засеяны ў адзінаасобным парадку, да арганізацыі калгасу, калгасьнікі ўбралі калектыўна. І тут парт'ячэйка сябе выявіла, агітуючы за калектыўную ўборку, за сумесную работу.

Вялікую ролю ў калектыўнай уборцы, ва ўкараценьні калектывізму і ўзьдыме прадукцыйнасьці працы ў калгасе адыграла грамадзкае харчаваньне. Яшчэ ў часе сяўбы, вясною, была арганізавана агульная сталоўка, якая кожны дзень пранускала 80-100 абедаў. На поле ў часе ўборкі дастаўляліся гарачыя абеды. Ясьлі дапамагалі ўзьняцьцю прадукцыйнасьці і наладжаньню сталай работы сярод калгасьніц.

Добрае кіраўніцтва парт'ячэйкі забясьпечыла ня толькі сталую арганізацыю працы і аплату ў калгасе, але і самае эфэктыўнае скарыстаньне гаспадарчага вопыту серадняка ў калгасе. Пасьля сяўбы ў праўленьне ўведзены тры сераднякі. Сераднякі — Карпенка Рыгор, Заблеў Кастусь і шмат іншых—былі першымі ініцыятарамі ўдарніцтва і сацыялістычнага спаборніцтва ў калгасе. Адначасова з прыцягненьнем серадняка да кіраўніцтва калгасам, парт'ячэйка мабілізавала вытворчую актыўнасьць батрацка-бядняцкіх мас, парт'ячэйка ўзьняла і палітычную актыўнасьць гэтых мас на барацьбу супроць антыкалгасных элемэнтаў, якія ўносілі разлад і падрыў працы ў калгасе.

Дзякуючы сацыялістычнаму спаборніцтву і ўдарніцтву, дзякуючы добраму кіраўніцтву ячэйкі, калгас імя Энгельса першым у раёне з посьпехам скончыў уборку і распачаў абмалот; першым у раёне арганізаваў чырвоны абоз і на ссыпны пункт ва Ўвяравічы даставіў 300 цэнтн. збожжа першага абмалоту.

Парт'ячэйка і кіраўнікі калгасу імя Энгельса добра ўсьвядомілі партыйныя дырэктывы аб узмацненьні дружбы калгасьнікаў з адзінаасобнікамі. Лёзунг партыі — Не цкаваць адзінаасобніка — ваўтрашняга калгасьніка — ператварыўся ў штодзённую праграмную дзейнасьць кіраўнікоў калгасу.

Калгас «Энгельс» вышаў на праверку мас: праўленьне калгасу робіць справаздачы перад адзінаасобнікамі ваколічных вёсак Сталінскага і Радзееўскага сельсаветаў аб сваіх посьпехах і барацьбе за калгасныя гаспадаркі.

Лепшай зарукай гэтай дружбы зьяўляецца тая дапамога, якую «Энгельс» аказвае адзінаасобнікам. У веснавую сяўбу калгасьнікі адпусьцілі адзінаасобнікам 1.500 пудоў аўса і грэчкі, 15 быкоў-вытворцаў, 4 жарабкі, баравоў, дапамагалі ўбіраць азімыя і яравыя 8-мі гаспадаркам. Цяпер калгасьнікі арганізавалі 2 малацільныя абозы для абмалоту азімых адзінаасобнікам.

Асеньняя пасеўная кампанія ў калгасе «Энгельс» ужо скончана. У бойку за бальшавіцкую восень радзееўскія камуністыя здолелі па-бявому і сваячасова мабілізаваць масы калгасьнікаў. У калгасе арганізаваны плянавыя групы па складаньні сустрэчнага прамфінпляну ў калгасе.

Паводле гэтага пляну азімы клін з 250 гэктараў павялічаны да 330, прадугледжваецца плошчу пад агародніну павялічыць у 2 з пал. разы.

І асеньняя пасеўная кампанія праходзіць праз мэтады сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. На выкананьне пляну асеньняй сяўбы мабілізавана актыўнасьць усіх калгасьнікаў.

Парт'ячэйка калгасу «Энгельс» зьяўляецца сапраўдным штабам кіраўніцтва калгасу. Яна шчыльна падышліла да ажыцьцяўленьня задач партыі ў галіне калгаснага будаўніцтва.

Е. Салдаценка.

Ударыць па апартуністычнай недаацэнцы работы з беднатой

Папярэднія вынікі раённых парткан-фэрэнцый сыгналізуюць аб невыстарчальнай работе раду вясковых раённых партарганізацый у галіне калектывізацыі с.-г. і правядзеньня чарговых сельска-гаспадарчых кампаній. Вопыт мінулай работы ў гэтых галінах паказвае, што найбольш буйныя прарывы дапускалі тыя ячэйкі, якія не мабілізавалі ўсёй савецкай грамадзкасьці і ў першую чаргу — галоўнай апоры партыі на вёсцы — калгасьнікаў і беднату — на выкананьне дырэктыў партыі.

Паасобныя партработнікі і ячэйкі ўспрынялі высунуты партыяй галоўны лёзунг аб апоры на калгасьнікаў, як адмаўленьне ад работы сярод беднаты. **Большасьць вясковых ячэек значна паслабіла сваю ўвагу да работы з беднатой, а некаторыя зусім яе не праводзяць.** Пры многіх выбарчых савецкіх і каапэрацыйных органах батрацка-бядняцкія групы не арганізаваны.

Гэта грубае ігнараваньне дырэктыў партыі аб рабоце з беднатой, як апартунізм на практыцы, незаўсёды сустракае з боку раённых партарганізацый належны бальшавіцкі адпор. На Лупалаўскай раённай партканфэрэнцыі з апартуністычнай прамовай выступіў **Шапавалаў**, які імкнуўся давесьці, што **работу з беднатой весьці нельга і непатрэбна.** З выступаўшых за ім у спрэчках таварышоў толькі два прамоўцы заўважылі, што **погляд Шапавала няправільны. Не дана належнай ацэнкі апартуністычнаму разважэньню і ў прынятай канфэрэнцыяй рэзалюцыі.**

Замест выкрыцьця недахопаў у рабоце шляхам шырокай бальшавіцкай самакрытыкі і бязьлітасцай барацьбы з апартуністычнай недаацэнкай работы з беднатой ёсьць факты замазваньня гэтай небясьпекі. Напрыклад, сакратар **Ляднянскага РК** інфармуе вышэйшы партыйны орган аб тым, што раённая партарганізацыя **дабілася значнага зруху ў рабоце з беднатой.** А раённая партканфэрэнцыя, якая нядаўна адбылася, **прызнала лінію РК няправільнай і работу невядаваньнючай, падкрэсьліваючы поўную адсутнасьць работы з беднатой.**

Недаацэнка работы з беднатой па-за калгасамі прыводзіць да таго, што ў асобных выпадках кулацкі элемэнт робіць свой варожы ўплыў на частку беднаты, дасягаючы ў паасобных выпадках зрыву мерапрыемстваў партыі на вёсцы. Такія зьявішчы мелі месца ў **Горацкім** раёне, дзе **на чале партыйнай арганізацыі было правапартуністычнае кіраўніцтва.**

Зараз, у пэрыяд шырока разгорнутай работы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у сувязі з вялікім ростам саўгасаў і калгасаў пашыраецца і ўзмацняецца апора партыі на вёсцы (саўгасныя рабочыя і калгасьнікі).

Аднак, ні ў якім выпадку нельга забываць і недаацэньваць ролі беднаты па-за калгасамі, як правадніка пралетарскага ўплыву ў справе сацыялістычнай перабудовы вёскі. З усякімі момантамі недаацэнкі работы з беднатой, як праявай апартунізму на практыцы, павінна весьціся бязьлітасная барацьба. Работа з беднатой павінна дасягнуць яшчэ большага замацаваньня саюзу з серадняком для найлепшага забесьпячэньня выкананьня пляну калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як кляс.

За савецкае дырыжаблябудаўніцтва

Уносяць і выклікаюць

Навуковы работнік **БДУ М. Югаў** уносіць 10 руб. на пабудову дырыжаблю імя газэты «Правда» і выклікае т.т.: **Карнажыцкага, Перцава і Стальнога.**

***

Калектыў супрацоўнікаў **ільна-пяньковага аб'яднаньня** ў колькасьці 26 чал. уносіць на пабудову дырыжаблю 61 р. і выклікае **ўсе аб'яднаньні ВСНГБ.**

Рабочыя млыну **«Адраджэньне»** (Менск) у ліку 23 чал. уносяць 46 руб. на пабудову дырыжаблю «Правда» і выклікаюць **эстатніх млыны г. Менску і служачых Менскага аддзяленьня Саюзхлеба.**

Работнікі **Талачынскага аддзяленьня сувязі** уносяць на пабудову дырыжаблю «Правда» аднадзенны заработак і выклікаюць **Талачынскі саюз мэдсанпрацы, Каханоўскую, Круглянскую і Аршанскую п.-т. канторы.**

Клічаўская райпартарганізацыя адлічыла ў фонд пабудовы дырыжаблёў: «Правда», «Клім Варашылаў» і ТСА-Авіяхіму» аднадзенны заработак, што складае 500 руб. і выклікае пасьледаць яе прыкладу **Чачавіцкую райпартарганізацыю.**

***

Члены бюро Чэрвеньскага РК КП(б)Б уносяць 40 руб. на пабудову дырыжаблёў імя Асоавіяхіму і газэты «Правда» і выклікаюць усе бюро РК Беларусі: Тав. Рай уносіць 5 руб. і выклікае т. т.: Баранчыка, Дзямкаўца, Манецка, Корша і Севасьцюка. Тав. Дзямкавец уносіць 6 руб. і выклікае: Хоміча, Мокрага, Алексеева. Тав. Баранчык уносіць 5 р. і выклікае Фадзеева, Дульцына і Шапіра. Тав. Манецка ўносіць 5 руб. і выклікае: Прокшыца, Тройніча, Кайзяновіча, Красільшчына. Тав. Фадзеняў уносіць 5 руб. і выклікае т. т.: Шыяна

Агульны сход працоўнага **яўрэйскага насельніцтва** м. Чэрвень на вечарыні, прысьвечаным антырэлігійнай кампаніі, сабраў на пабудову дырыжабля 165 р.

***

Нарада старшынь ФЗМК **Рагачэўскага раёну** ў колькасьці 19 чал. унесла на пабудову дырыжабля імя газэты «Правда» 23 р. і выклікае прафактыў **Жлобінскага і Слуцкага раёнаў** пасьледаваць гэтаму прыкладу.

***

Тав. Юшкевіч, прымаючы выклік т. Асіпчыка, уносіць на пабудову дырыжабля «Правды» 5 руб. і выклікае супрацоўнікаў ЦВК: **Зенькевіча, Алініцкую, і Дайліду.**

***

Сакратар **Вульскага РК КП(б)Б Маўшовіч** уносіць 5 руб. у фонд пабудовы дырыжабля імя газэты «Правда» і выклікае ўсіх сакратароў райкомаў КП(б)Б б. Полацкай акругі: **Пушчына, Пахопня, Клімчука, Меерзона, Мышэлова, Бэдржыцкага, Самсоненка, Кавалёнка,** а таксама выклікае т. т.: **Воўкава, Славіна, Гольдэрга, Бікашова, Сітнікава, Вайзбэрга, Кучынскага, Аругаховіча, Статута, Рэйнгальда, Аксёмава, Бурнэйка, Шапіра і ўсе арганізацыі Вульшчыны.**

Адвесьці ўдар!

ГРАМАДЗКАСЬЦЬ САЎГАСАЎ „СЬВІНАВОДА"—УСЕ СІЛЫ НА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВУ!

Вырашэньне мясное праблемы зьяўляецца аднэй з асноўных задач палітыкі партыі і ўраду. Сыстэма «Сьвінавода»—важнейшае зьвяно ў мерапрыемствах па вырашэньні мясное праблемы. На БССР «Сьвінавод» ужо мае **58 саўгасаў з агульнай плошчаю ў 50.000 гэктараў і звыш 5.000 сьвінаматак.** Сабраны некаторыя тэхнічныя кадры. Рад рабочых калектываў сапраўды пабальшавіцку ужо ўзяліся за арганізацыю мясных фабрык.

Але ход будаўніцтва ў саўгасах «Сьвінавода» гаворыць за тое, што пляны арганізацыі сьвінаводных гаспадарак усё яшчэ знаходзіцца пад ударам. З 57.000 вызначаных сьвінамесц фактычна будуецца 10.000 (ня лічачы прыстасаваньня старых будынкаў). Саўгасы ня выкарысталі ўсіх магчымасьцяй па вярбоўцы рабочае сілы, падвозцы матар'ялаў, замены дэфіцытных матар'ялаў мясцовымі. Увага грамадзкасьці саўгасаў ня была прыцягнута да будаўніцтва. Ня было і рабочага кантролю над ім. Дырэктары саўгасаў, замест актыўнай дапамогі Белкалгасбуду, спакойна чакалі, калі скончыцца будаўніцтва і правялі яўны апартунізм на практыцы ў гэтай важнейшай справе.

Замест 20.000 сьвінаматак, якія павінны былі быць сабраны на 1 кастрычніка, ёсьць толькі 6.800. У гэтым вінаваты ня толькі загатоўчыя арганізацыі, але і самі саўгасы, якія не наладзілі штодзённага кантролю за зборам сьвінаматак і ўкамплектаваньнем саўгасаў.

У паасобных савецкіх гаспадарках сьвінаматкі трымаюцца яшчэ ў вельмі дрэнных умовах. Гэта выклікае частыя захворваньні і гібель сьвінаматак. Інакш, як шкодніцтвам, такія адносіны лічыць нельга. На 7 верасьня ў саўгасах «Сьвінавода» было ўбрана толькі 88% траў. Пры недахваце кармоў ні адзін цэнтнэр сена ня можа застацца няўбраным. У хвасьце плятуцца саўгасы **Халопенічы, Насовічы, Райцы, Лемніца, Баноць і інш.** Толькі 52 проц. яравых былі зьняты з палёў. Адстаюць саўгасы Новыя Зяленькі, Замошша, Баноць, Райцы, Шыкатовічы і інш. Сіласаваньне выканана ўсяго ў разьмеры 4,62 проц. пляну. Яўна нездавальняюча разгорнуты абмалот. У радзе саўгасаў нездавальняюча ідзе збор садавіны і агародніны. Адным з асноўных недахопаў у рабоце раду саўгасаў зьяўляецца кепская арганізацыя працы і нізкая прадукцыйнасьць яе. Парт'ячэйкі і рабкомы саўгасаў ня здолелі яшчэ стаць на чале актыўнасьці рабочых калектываў.

Уся грамадзкасьць саўгасаў «Сьвінавода»—партыйныя ячэйкі, рабочыя камітэты, спэцыялістыя і дырэктары зараз-жа павінны мабілізаваць усю ўвагу вакол выкананьня прамфінпляну гэтага году і належнай падрыхтоўкі да сустрэчы трэцяга году пяцігодкі.

Неабходна зараз разгарнуць шырокае сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцкі рух вакол хутчэйшага сканчэньня будаўніцтва ў саўгасах, поўнага збору сьвінаматак, лепшага іх утрыманьня і сваячасовага сканчэньня ўборкі ўраджаю і асеньняй сяўбы.

Стварэньне кармовай базы патрабуе, каб ні адзін цэнтнэр зялёнае масы не застаўся нескарыстаным у калгасах «Сьвінавода».

Зяблевае ворыва зьяўляецца важнейшай зарукай пасьпяховай сяўбы 1931 году. Ні адзін гэктар пахаці не павінен застацца няўзораным.

Адозву ЦК УсеКП(б) аб сустрэчы трэцяга году пяцігодкі трэба давесьці да кожнага рабочага, разгарнуўшы на яе падставе самаправерку выкананьня прамфінпляну сьвінаводных саўгасаў.

Калектывы саўгасаў павінны ва ўсеўбраеньні сустрэць 1 кастрычніка—усесаюзны дзень ударніка.

Камсамол і вясковая грамадзкасьць—на дапамогу саўгасам «Сьвінавода»!

АЎЧЫНЬНІКАЎ.

Падрыхтуем кадры для рыбнай прамысловасьці

Ад ступені разьвіцьця рыбнай прамысловасьці БССР у значнай меры на даным этапе вызначаецца ступень вырашэньня праблемы харчаваньня.

У мэтах рэалізацыі пастановы XIII партзьезду калегія Наркамгандлю БССР, перагледзеўшы будаўнічыя пляны Белрыбы, ухваліла ўзмацніць будаўніцтва рыбных прудавых гаспадарак і замест трох прудавых гаспадарак, плошчаю ў 3.000 га, якія будуюцца ў 1930 годзе—прапанавала Белрыбе падшукаць і закончыць праектаваньне ў зімовы сэзон для будаўніцтва на 1930-31 год гаспадарак ня менш, чым на 10.000 га.

Адзіная цяжкасьць у вырашэньні гэтага пытаньня заключаецца ў недахопе спэцыялістых па рыбнай прамысловасьці.

Калегія Наркамгандлю СССР ухваліла рэарганізаваць Жыткавіцкую прафтэхшкоду рыбаводства, рыбаводны тэхнікум, які [illegible] а друг аддзяленьняў—рыбаводнага і гідратэхнічнага.

Ня гледзячы на тое, што кожная з гэтых арганізацый добра паведамлена аб задчыненьні ў 1930 годзе рыбаводнага тэхнікуму, яшчэ і дагэтуль зусім нічога не зрабілі ў справе ўкамплектаваньня тэхнікуму. Яшчэ ня ўсюды рабочыя лаўцы ведаюць аб рыбаводным тэхнікуме, не гаворачы ўжо аб шырокай папулярызацыі яго сярод працоўнага насельніцтва.

Прыём дакумантаў у Жыткавіцкі рыбаводны тэхнікум будзе працягвацца да 1-га кастрычніка 1930 году. Заняткі пачнуцца 15-га кастрычніка. Раённым партыйным камітэтам і кожнай з вышэй азначаных арганізацый трэба разгарнуць работы па папулярызацыі рыбагасаў, батракоў, непасрэдна рабочых лаўцоў з вытворчасьці і калгасьнікаў, ты пэрыяд часу забясьпечыць рыбаводны тэхнікум неабходным складам слухачоў.

І. Плыс.

ВАМ НЯ СПЫНІЦЬ

ПЕРАМОЖНАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ САЦЫЯЛІЗМУ

На шкодніцтва разанцавых адкажам арганізацыяй тысяч новых мясных фабрык

У ТРЭЦІМ ГОДЗЕ ПЯЦІГОДКІ ВЫРАШЫМ МЯСНУЮ ПРАБЛЕМУ

Пачнем самаправерку справы жывёлагадоўлі ў калгасах і саўгасах

АДКАЗ КЛЯСАВЫМ ВОРАГАМ

Адкрыты ліст у рэдакцыю газэты „Зьвязда"

Пралетарыят, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, аддае ўсе сілы, увесь творчы энтузіязм для пераможнага выкананьня другога году пяцігодкі і падрыхтоўкі да трэцяга году.

Клясавыя ворагі ўсямерна стараюцца сарваць наша сацыялістычнае будаўніцтва. Паны Разанцавы і інш. хацелі замарыць юладам краіну Саветаў і тым самым сарваць індустрыялізацыю. Яны панесьлі заслужаную кару. Але яшчэ ёсьць нямала ворагаў. Наш ім адказ: кароткі рукі, паны. **Вам ня спыніць пераможнага наступленьня сацыялізму,** *вам не сарваць індустрыялізацыю і калектывізацыю* **савецкай краіны.**

Мы, прадстаўнікі калгасаў, трох саўгасаў і 70 адзінаасобнікаў у адказ нашым ворагам заяўляем, што аддамо ўсе свае сілы на хутчэйшае разьвіцьцё жывёлагадоўлі і ў асаблівасьці сьвінагадоўлі і тым самым ліквідуем нашы часовыя труднасьці па рабочым забесьпячэньні.

Мы абяцаем выканаць і перавыканаць нашы пляны трэцяга году пяцігодкі. Мы адказваем на нападкі нашых ворагаў 100-процантнай падпіскай на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады», сваячасовым выкананьнем пляну мясазагатовак і збожжазагатовак.

Большасьць з нас скончыла ўборку ўраджаю і асеньняю сяўбу. Мы з гэтымі задачамі справіліся з гонарам.

Цяпер наша задача заключаецца ў арганізацыі сьвінарнікаў, пабудове хлявоў. Мы абяцаем даць нячуваныя тэмпы ў разьвіцьці сьвінагадоўлі. Увесь трэці год пяцігодкі мы будзем працаваць над вырашэньнем гэтых задач па-ўдарнаму, па-баявому. *Мы

ДЗЕНЬ УДАРНІКА—

пачатак барацьбы за выкананьне плянаў баявога кварталу

Праверыць гатоўнасьць! Расставіць сілы!

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ АСІНБУД АБСТАЛЯВАНЬНЕМ!

АДКРЫТЫ ЛІСТ СТАРШЫНІ ВСНГБ т. ГРЫСЕВІЧА МЭТАЛІСТЫМ ГОМЕЛЬСКАГА ЗАВОДУ „ПРАЛЕТАРЫ"

Дарагія таварышы!

Будаўніцтва Асінбуду, якое мае надзвычайна вялікае палітычнае і гаспадарчае значэньне ў жыцьці Савецкай Беларусі, падыходзіць да канца.

Але ёсьць затрыманьне работы, як заявіў мне пры агляде будаўніцтва галоўны інжынэр Асінбуду т. Алейнікаў, з прычыны несвачасовага выкананьня вамі заказу каробы для эканомайзэра і некаторых іншых дэталяй.

Прэзыдыум ВСНГБ упэўнены, што мэталістыя Гомельшчыны прымуць усе меры, каб выканаць, як мага хутчэй, заказ і прасачыць за адгрузкай яго і гэтым самым забясьпечыць пуск першай чаргі Асінбуду імя Сталіна—7-га лістапада.

Старшыня ВСНГБ **Грысевіч.**

27-IX-30 г.

Даць у тэрмін кантрольныя лічбы

Прадпрыемствы чакаюць

Заўтра канчаецца гаспадарчы 1929-30 год. Надыходзіць ударны трохмесячнік — кастрычнік — сьнежань, які будзе мець свой самастойны прамфінплян.

Толькі своячасовае складаньне кантрольных лічбаў аб'яднаньнямі дасьць магчымасьць нашым фабрыкам і заводам іх распрацаваць на агульных сходах рабочых, вытворчых нарадах і высунуць свой сустрэчны прамфінплян на гэты квартал.

Па некаторых аб'яднаньнях яшчэ няма належных тэмпаў у гэтай рабоце.

Аб'яднаньні не сьпяшаюцца перадаць кантрольныя лічбы на распрацоўку самімі прадпрыемствамі.

Так у БЕЛСКУРАБ'ЯДНАНЬНІ кантрольныя лічбы ўжо складзены, але чамусьці не адсылаюцца на прадпрыемствы У БЕЛШЧАЦІНЕ кантрольныя лічбы былі складзены 26 верасьня і зацьверджаны ЦП саюзу гарбароў, але таксама засталіся ляжаць у аб'яднаньні.

— У нас ня было людзей, каб іх разаслаць на прадпрыемствы, — кажа дырэктар трэсту. Прычына «ўважлівая»!

У БЕЛШВЭЙАБ'ЯДНАНЬНІ складаньне кантрольных лічбаў толькі заканчваецца.

Заводы і фабрыкі павінны ва што-б там ні стала своячасова атрымаць кантрольныя лічбы. Іх затрыманьне моцна б'е па разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва, тармозіць складаньне сустрэчных плянаў і пазбаўляе магчымасьці своячасова прыступіць да іх выкананьня.

Наперакор прароцтвам апартуністых

28 верасьня Бабруйская шчацінная фабрыка з посьпехам выканала прамфінплян 1929-30 гаспадарчага году. Разам з выкананьнем колькаснага гадавога заданьня фабрыка, замест прадугледжанага па пляне зьніжэньня сабекошту на 8 проц., дабілася яго зьніжэньня на 9,6 проц.

На ўрачыстым вечары, прысьвечаным выкананьню прамфінпляну, былі прэміяваны 14 лепшых ударнікаў. Рабочыя, якія выступалі на вечары, адзначалі, што пасьпяховае сканчэньне другога году пяцігодкі дасягнута дзякуючы напружанай бальшавіцкай рабоце і непрымірымай барацьбе з праваапартуністычнымі ныцікамі, якія ў часе прарыву ў першым квартале хацелі тлумачыць прарыў нерэальнасьцю плянаў. На вечары больш 50 проц. рабочых змацаваліся на заводзе да канца пяцігодкі.

110,6 і 112

Нова-Барысаўскі дрэваапрацоўчы камбінат імя Камінтэрну на 27 верасьня выканаў гадавы плян з перавышэньнем па лесапільнай вытворчасьці на 110,6 проц. і па фанэрнай—на 112 проц.

Адозва ЦК УсеКП(б) падняла на камбінаце новую хвалю энтузіязму рабочых, які выявіўся ў арганізацыі брыгады імя 3-га году пяцігодкі, у якую запісалася 112 чалавек. 207 рабочых камбінату замацаваліся да канца пяцігодкі.

Дырэктар заводу **КАЗІМІРЧЫК**
Старшыня заўкому **МІМАС.**

Рыхтуюцца да дэманстрацыі

Рад прадпрыемстваў Фрунзаўскага раёну («Камунар», «Дрэваапрацоўшчык», «Пралетары», хлебазавод і інш.) пастанавілі арганізаваць 30-га верасьня масавую дэманстрацыю, каб паказаць свае дасягненьні ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну другога году пяцігодкі і заявіць аб сваёй гатоўнасьці сустрэць ударны квартал.

Па прадпрыемствах вядзецца ажыўленая работа па падрыхтоўцы да дэманстрацыі.

Б.

Вытворчыя манэўры на „Дрэваапрацоўшчыку"

Завод «Дрэваапрацоўшчык» уключыўся ў вытворчыя манэўры 23 верасьня.

За кароткі час штаб манэўраў здолеў арганізаваць рад практычных мерапрыемстваў. Удзельнікі манэўраў правяраюць забесьпячэньне заводу сырцом, падрыхтаванасьць цэхаў да павялічанай выпрацоўкі, работу сушылкі.

Вяпікая ўвага аддаецца праверцы разгрузкі цэхаў ад паўфабрыкатаў і рэалізацыі рабочых прапаноў. У гэты-ж час абвешчаны паход за рабочыя прапановы.

Разгарнулася шырокая работа па выяўленьні інжэ-ўдарнікаў, прагульшчыкаў. На заводзе былі факты, што з-за адсутнасьці замка гатовыя шафы не маглі дайсьці да рабочага спажыўца. Таму ўдзельнікі манэўраў правяраюць запас дэталяй. За час уключэньня заводу ў вытворчыя манэўры вдзін толькі зборшчык сабраў 12 прапаноў. Ужо пачалася разгрузка цэхаў. Выяўлены прычыны недагрузкі сушылкі. Арганізоўваецца выстаўка браку. Удзельнікі манэўраў узмоцнена рыхтуюцца да «Дня ўдарніка». Зноў арганізаваны 17 ударных брыгад, якія ў свой час з-за адсутнасьці кіраўніцтва распаліся.

Паміж новымі арганізаванымі брыгадамі разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва.

У сувязі з перавыкананьнем прамфінпляну на заводзе ёсьць частковыя дэмабілізацыйныя настроі. З гэтымі настроямі вядзецца рашучая барацьба. Арганізоўваецца грамадзка-палітычны суд над інжэ-ўдарнікамі. РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ РЫХТУЮЦЬ ДА «ДНЯ ЎДАРНІКА» РАПАРТ БАЛЬШАВІЦКАМУ ЦК. Павялічваецца прыплыў моладзі рабочых аб'ступленьні ў партыю.

Яз, С-ны.

Скончылі 27 верасьня

АРШАНСКІ ЗАВОД «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» ПРАМФІНПЛЯН 1929-30 ГОДУ ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЎ ДА 27 ВЕРАСЬНЯ.

З ГЭТАГА ЧАСУ РАБОТА ІДЗЕ НА 3-ці ГОД ПЯЦІГОДКІ.

ДЫРЭКТАР ЗАВОДУ КАБАЧЫНСКІ.
САКРАТАР ПАРТКАЛЕКТЫВУ ПАХОМАЎ.
СТАРШЫНЯ ЗАЎКОМУ НОВІК.

Калі сьціхаюць паравозныя гудкі

Алімпійскі спакой аршанскага Вучкрафсожу

Ня гучнымі рэзалюцыямі, а гэроікай спраў штурмуйце прарыўныя будкі!

На Аршанскім чыгуначным вузьле адозва ЦК УсеКП(б) дагэтуль даведзена не да ўсіх рабочых. Абмінуты яна ў прыватнасьці і рабочых вугальнага складу, рабочых, што аб'ядноўваюцца мясцкомам паравіковых і цягніковых брыгад.

Большасьць мясцкомаў, на чале з вучкрафсожам, лічыць, што адозва працавана на «яць». І мае рацыю! Па мясцкоме рамонту № 11 на дакладзе намесьніка старшыні вучкрафсожу т. Хвядулава вынесена рэзалюцыя:

— Адозву ЦК УсеКП(б) прыняць да ведама...

А справы? А буднічная штодзеннасьць? Яны гавораць зусім іншае...

Не супакойваецца трэ'было Вучкрафсожу, ня выкідваць прыгожыя рэзалюцыі, а біць трывогу, змагаючыся з бальшавіцкай упартасьцю за ліквідацыю буйнейшых прарываў і недахопаў.

Паляпшэньня ў выкананьні транспартнага фінпляну няма. Наадварот, калі ў чэрвені назіралася невялічкае паляпшэньне, дык з кожным месяцам справа коціцца ўніз; за верасень становіцца нікудышнае. Паводле раскладу, адпраўляюцца штодзенна толькі 46 проц. цягнікоў. Бывалі такія выпадкі, калі зрывалася адпраўленьне 5—6 цягнікоў на суткі.

Станцыя сыстэматычна несвачасова выдае паравозы для возкі бачнасьці. Гэта выклікае прастоі рабочых на 2-3 гаты.

Сустрэчны трафінплян не прапрацаваны на пераважнай большасьці цэхаў і зьмен. Па мясцкоме цягніковых і паравіковых брыгад, які аб'ядноўвае звыш 700 членаў саюзу, ён яшчэ і не абмяркоўваўся.

Нікудышнымі, марудным тэмпамі ішла падрыхтоўка да Дня ўдарніка. Ня было праведзена выяўленьне лепшых ударнікаў вузла. Брыгады ўтвораны, але адцьвілі, не пасьпеўшы расквітнець...

Ня ў лепшым становішчы і рэалізацыя пастановы ЦК УсеКП(б) аб асеньня-зімовых перавозках. Вучкрафсож разаслаў усім мясцкомам свае прапановы па гэтай пастанове толькі 23-га верасьня. У мясцкомах — «ціп ды гладзь».

Калі інжынэрна-тэхнічная сэкцыя 17-га верасьня ў парадак дня ўнесла прапрацоўку пастановы ЦК, дык старшыня Вучкрафсожу т. Мартусэвіч прапанаваў у час пасяджэньня зьняць гэтае пытаньне, кажучы:

— Як вы будзеце прапрацоўваць пастанову, калі не атрымалі яшчэ ад мяне дырэктыў?

Бюро парткалектыву глядзіць на гэта скрозь пальцы.

Вось, у якім становішчы на Аршанскім вузьле прапрацоўка адозвы ЦК УсеКП(б) і пастановы ад 10-га верасьня. Вось, як праводзіцца на практыцы важнейшыя мерапрыемствы партыі...

Я.

Паход ЦСПСБ на прадпрыемствы

Сапраўдная перабудова прафработы---гэта сто процантаў прамфінпляну

Тав. БУДЫРЫН—брыгадзір ЦСПСБ

Не дапамагаюць ударным брыгадам

Ня гледзячы на тое, што адозва ЦК на «Чырвонай Бярэзіне» і «Пралетарскай Перамозе» фармальна была даволі шырока прапрацавана, адпаведнага пералому ў выкананьні прамфінпляну да гэтага часу няма. Так, вынікі за 20 дзён верасьня па выкананьні прамфінпляну зьяўляюцца далёка нездавальняючымі. На «Пралетарскай Перамозе» за гэты час прамфінплян выкананы толькі на 80 проц.

Адным з вялікіх недахопаў трэба лічыць тое, што заводзкія арганізацыі ня маюць дакладнага вучоту работы ўдарных брыгад. Няма вучоту эфэктыўнасьці ўдарніцтва. У цэхах (аўтаматны і інш.) нам не ўдалося знайсьці матар'ялаў, якія-б гаварылі аб колькасьці ўдарнікаў. Прагулы на фабрыцы і спазьненьні на работу замест зьніжэньня даюць значны рост.

Новыя формы сацспаборніцтва (грамадзкі буксір, «сквозные» брыгады і г. д.) яшчэ не знайшлі канкрэтнага прадамленьня па фабрыцы. У некаторых цэхах былі спробы арганізаваць «сквозные» брыгады, але з гэтага нічога не атрымалася, бо рабочыя не знайшлі падтрыманьня з боку фабрычных арганізацый. Фабрычныя грамадзкія арганізацыі і адміністрацыя ня прынялі адпаведных мер барацьбы з тэхнічнымі прастоямі. Так, 4-га, 5-га і 6-га верасьня было 154 гадзіны прастояў з-за недахвату сырцу і з-за невыстарчальнага тэхнічнага нагляду за варштатамі з боку мацнёраў і адміністрацыйнага пэрсаналу. Фабрыка зусім не забясьпечана патрэбнай колькасьцю сырца.

На фабрыцы адсутнічае патрэбная выразнасьць і плянавасьць у рабоце. Гэтымі днямі ў адным з машын аўтаматнага цэху сапсавалася дэталь, адміністрацыя, замест таго, каб пашукаць на сваіх складах патрэбную частку, пачала засыпаць тэлеграмамі Менск і Маскву аб высылцы дэталяй. Урэшце, праз некалькі гадзін аказалася, што такіх частак на складах заводу можна знайсьці значна больш, чым патрэбна.

На пытаньні збору рабочых прапаноў фабкомам была распрацавана анкета, якая раздана ўсім рабочым. Да гэтага часу ніводнай анкеты і ніводнай прапановы не паступіла. Фабкомаўцы зараз вымушаны прызнацца, што анкета зьяўляецца вельмі бюракратычнай, з дзесяткамі непатрэбных пытаньняў.

Брыгада ў складзе т. т. ДАМБРОЎСКАГА (старшыня ЦП саюзу мэталістых) і ХУРСІКА (член прэзыдыуму ЦП саюзу горнарабочых)

Не здамо сваіх пазыцый і ў 3-ім годзе пяцігодкі

Пасьля прапрацоўкі адозвы ЦК на заводзе «Камунар» вызначыўся пералом у рабоце цэху. Адносіны рабочых да пытаньняў вытворчасьці значна палепшыліся. Значная частка рабочых, усьвядоміўшы задачы, пастаўленыя партыяй перад рабочай клясаю аб падрыхтоўцы да трэцяга году пяцігодкі, паказала сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы. Так, калі да прапрацоўкі адозвы ЦК вырабляліся 250 сьвідравальных варштатаў, дык зараз—600 варштатаў.

У выніку прапрацоўкі адозвы, на заводзе назіраецца вялікі рост удзельнікаў ва ўдарных брыгадах. Арганізавана 4 «сквозные» брыгады, якімі ахоплена 197 чалавек. Арганізавана група энтузіястых з 57 камсамольцаў. Падрыхтоўваецца арганізацыя батальёну энтузіястых.

Інжынэрна-тэхнічныя работнікі заводу на сваім сходзе прынялі пастанову, па якой абавязаліся заставацца на заводзе да канца пяцігодкі.

Кантрольныя лічбы шырока абмяркоўваліся ва ўсіх цэхах, агрэгатах і брыгадах. Рабочыя высунулі свой сустрэчны прамфінплян, паводле якога кантрольныя лічбы павялічаны на 32,6 проц. Прамфінплян на 1931 год, параўнальна з 1929-30 г., павялічаны на 112 проц.

Да дня ударніка заводзкімі арганізацыямі разгорнута даволі шырокая падрыхтоўчая работа. У цэхах і брыгадах рабочыя абмяркоўваюць кандыдатуры лепшых ударнікаў для прэміяваньня. Зараз арыентовачна вызначана каля 12 асоб.

За час штурму ад рабочых паступіла больш 160 прапаноў па пытаньнях рацыяналізацыі і паляпшэньня работы на вытворчасьці. Паступіўшыя прапановы ад рабочых разглядаюцца бюро рацыяналізацыі. Выкананьне прапаноў рабочых дало заводу эканомію ў суме 76.000 руб.

Дзякуючы раду мерапрыемстваў, прынятых заводзкімі арганізацыямі па барацьбе з інжэ-ўдарніцтвам, прагуламі і спазьненьнямі на работу, значна зьнізілася працоўная дысцыпліна на заводзе. Так, у верасьні месяцы на заводзе няма ні аднаго дня прагулу.

Мы маем поўнае права меркаваць, што завод «Камунар» ня здасьць сваіх пазыцый у трэцім годзе пяцігодкі.

СКОНЧЫЦЬ У ТЭРМІН

Яшчэ з вясны Белдзяржбудам распачата будаўніцтва кацельнага цэху заводу «Энэргія». З першых крокаў работы выявіліся нядбайныя адносіны да пабудовы з боку Белдзяржбуду. Быў вылучаны прараб, які на працягу двух месяцаў палец аб палец ня ўдарыў на пабудове. Па ініцыятыве рабочай брыгады прараб быў зьняты з работы.

Пасьля гэтага, будаўніцтва, як быццам пасунулася наперад. Зараз сьцены выведзены. Трэба прыступіць да пакрыцьця дахам, а дошак няма. Белдзяржбуд не паклапаціўся раней, каб забясьпечыць будаўніцтва патрэбным матар'ялам, а таму пабудова апынулася пад пагрозай зрыву. Калі-ж Белдзяржбуд да 1-га кастрычніка не забясьпечыць пабудову дошкамі, дык будаўніцтва напэўна спыніцца.

Справа яшчэ пагаршаецца ў сувязі з тым, што няма матар'ялу для пабудовы фэрм.

Нельга не адзначыць нядбайных адносін да пабудовы з боку прараба. На запытаньне рабочых брыгады—ці забясьпечана пабудова матар'ялам, прараб прабаваў займацца «очковтирательством», запэўняючы, што патрэбным матар'ялам забясьпечыць. Таму ён не даводзіў да ведама адпаведных арганізацый пра створаную пагрозу спыненьня будаўніцтва.

На кацельным цэху заводу «Энэргія» прыпадае 50 проц. прамфінпляну 1930-31 г. І калі будаўніцтва ня будзе скончана ў тэрмін, дык ствараецца фармальная пагроза ад невыкананьні прамфінпляну заводам «Энэргія».

Белдзяржбуд павінен усё гэта ўлічыць і будаўніцтва кацельнага цэху закончыць у тэрмін.

Брыгадзір «Зьвязды»—Л.

Калі-ж саўгасы возьмуцца за збожжазагатоўкі?

„Саўгаскае збожжа ўсёроўна ад нас не ўцячэ---вось узор тыповай апартуністычнай „філёзофіі"

Саўгасы плятуцца ў хвасьце—Яны выканалі толькі 19,2 проц. верасьнеўскага пляну

Злачынна дрэнна даюцца цьвёрдыя заданьні купацкіх гаспадарках

Загатоўкі за 25 дзён верасьня

За апошнюю пяціднеўку верасьня, на 25-га паступіла 6931 тона збожжа або 29,1 проц. месячнага заданьня.

Усяго за 25 дзён верасьня загатоўлена 21.803 тоны, або 91,6 проц. месячнага павялічанага пляну хлебазагатовак.

Па асобных сэктарах месячны плян выкананы наступным чынам: індывідуальныя гаспадаркі за 25 дзён верасьня здалі 102,1 проц.; калгасы—74,8 проц., саўгасы—19,2 проц., па кантрактацыі—100,4 проц.

Неадкладна выправіць памылкі

Мабілізаваць грамадзкасьць на барацьбу з кулаком

Наш супрацоўнік правёў гутарку з начальнікам сэктара загатовак Наркамгандлю т. БАРКОЎСКІМ аб ходзе загатовак.

— Лічбы сьведчаць аб тым, што ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПАВЯЛІЧАНАГА МЕСЯЧНАГА ВЕРАСЬНЕЎСКАГА ЗАДАНЬНЯ ЗАБЯСЬПЕЧАНА, АЛЕ ВЫКЛЮЧНА ЗА КОШТ ІНДЫВІДУАЛЬНАГА СЭКТАРА.

Калгасы да гэтага часу ўсё яшчэ адстаюць. Калгасы не выявілі свае таварныя лішкі і ня склалі плянаў здачы хлеба. Слаба здаецца нават абавязковая норма. Такія тэмпы здачы хлеба калгасамі не забясьпечваюць 100 проц. выкананьня пляну.

Недапушчальна марудна выконваюць плян хлебазагатовак саўгасы. Выкананьне пляну адстаюць нетрэставаныя, саўгасы. Няма кантролю з боку райвыканкомаў за тым, як выконваюць саўгасы свае абавязкі.

100,4 проц. выкананьня пляну кантрактацыі здаецца, гаворыць аб здавальняючым становішчы, але гэта далёка ня так. На самай справе, толькі нязначная частка закантрактаваных гаспадарак здае збожжа. Большая частка кантрактантаў яшчэ ня прыступіла да здачы. Высокая лічба выкананьня верасьнеўскага пляну тлумачыцца тым, што тыя гаспадаркі, якія здаюць жыта па кантрактацыі, адразу выконваюць сваё гадавое заданьне.

Тэмпы выкананьня пляну індывідуальным сэктарам не гарантуюць выкананьня далейшых прапаноў загатовак, бо ў кастрычніку патрабуюцца падвоенныя тэмпы. Выбярачнае абсьледваньне, якое была праведзена Наркамгандлем, выявіла, што ў радзе раёнаў плян даведзены да сяла няправільна. У некаторых раёнах з прычыны слабой растлумачальнай работы, прыняты яўна перапаменшаныя пляны.

Многія раёны да гэтага часу яшчэ ня выявілі кулацка-заможных гаспадарак і не далі ім цьвёрдых заданьняў. У выніку кулак у радзе месц пасьпеў схаваць і разбазарыць свае збожжа.

Ёсьць вёскі (Лепацінскі сельсавет, Прапойскага раёну), дзе па самаабавязацельствах прыняты пляны здачы усяго ў разьмеры 60 пуд. Гэта ў той час, калі вёскі яўна заможныя. У гэтым сельсавеце ні аднэй гаспадарцы не дана цьвёрдае заданьне па здачы збожжа.

Такія апартуністычныя адносіны да кулака адбіваюцца на забясьпячэньні выкананьня насёлішчнага пляну збожжазагатовак.

Выразным прыкладам вынікаў слабага адпору кулаку і адсутнасьці работы з беднатой можа служыць Чыжэвіцкі сельсавет, Старобінскага раёну. Толькі 21 верасьня гэтым сельсаветам дана кулакам цьвёрдае заданьне аб здачы збожжа. Кулак Сасун за гэты час ужо пасьпеў прымазацца да чырвонага абозу і замест вызначаных яму 100 пуд. жыта, здаў 26 пуд. аўса. Ён атрымаў за гэта прэмію мануфактурай, аднолькава з бядняцка-сераднякам часткай вёскі, якая здавала свае збожжа ў добраахвотным парадку.

Памылкі, якія былі дапушчаны на працягу верасьня, павінны быць тэрмінова выпраўлены. У кастрычніку павінна паступіць ня менш 50 проц. усяго пляну па збожжазагатоўках, адпаведна павінны быць узмоцнены тэмпы здачы збожжа.

Паводле вестак, якія ёсьць у Наркамгандлю, на мясцох усё яшчэ вельмі мала зварачаецца ўвагі якасьці збожжа, якое здаецца. Ёсьць рад фактаў, калі ня толькі індывідуальныя гаспадаркі, але нават калгасы і саўгасы здаюць нядобраякаснае збожжа. Так саўгас Фаніполь здаў збожжа з 22 проц. вільготнасьці. Такое збожжа на складах нельга захаваць, і Саюзхлеб вымушаны быў адразу накіраваць яго на пераапрацоўку. На мясцох трэба разгарнуць шырокую растлумачальную кампанію аб неабходнасьці сушкі збожжа і аб здачы дзяржаве выключна добраякаснага збожжа. Пры напежнай увазе шырокай грамадзкасьці, БССР, як і ў мінулым годзе, першая выканае 100 проц. пляну збожжазагатовак.

Арк.

Не хапае складаў і вагі

Камсамольская брыгада калектыву Наркамгандлю абсьледвала становішча работы па збожжазагатоўках сыстэмы Белкаапсаюзу і Белпаляводсаюзу.

У сваіх вывадах брыгада адзначае, што каапэрацыйныя арганізацыі аддаюць мала ўвагі загатоўкам, а мясцамі назіраюцца злачынна-нядбайныя адносіны да загатовак.

Загатоўкі не забясьпечаны тарай. Месячнік тары ў большасьці раёнаў прайшоў без мабілізацыі грамадзкасьці і ня даў вынікаў. Бягомльскі райпаляводсаюз спакойна адказвае: «Збор тары не праводзіцца, бо ў раёне няма мяшкоў для продажу і ніхто не прадае тары».

У сыстэме Паляводсаюзу ляжаць нескарыстанымі 18.000 мяшкоў, якія вельмі патрэбны органам Саюзхлеба. Белкаапсаюз таксама винен Саюзхлебу 76.000 мяшкоў, аднак, ён і ў вус ня дзьме і не аддае тару.

Нічога ня робіцца для арганізацыі сустрэчнага пляну загатовак, у той час, як ёсьць база для стварэньня сустрэчнага пляну, бо пляны загатовак узяты мінімальныя.

Збожжазагатоўчыя арганізацыі фармальна падыходзяць да прыёму чырвоных абозаў, не ўсьвядоміўшы палітычнага значэньня гэтага мерапрыемства. Белпаляводсаюз нават ня лічыў патрэбным адзначыць сваёй сыстэме аб дапамозе арганізацыі чырвоных абозаў.

Самае нездавальняючае становішча са складамі. Белпаляводсаюз зусім ня ведае, дзе будуюцца склады. Тэрміны пабудовы ўсё адкладаюцца на пазьнейшы час. Сыстэма Белкаапсаюзу мае складаў на 3.086 вагонаў, трэба яшчэ на 1.280. Вінаватых у зрыве будаўніцтва складаў трэба прыцягваць да адказнасьці.

Не хапае вагі, гір і пурак. Замест таго, каб прыняць меры да забясьпячэньня пунктаў, гэтым інвэнтаром, збожжазагатоўчыя арганізацыі займаліся папяровай цыганшчынай, чакалі інвэнтару з Масквы, у той час, як пад бокам працуе завод «Камунар», які можа выраблядь вагу і гіры. Спажывецкая каапэрацыя мае 478 камплектаў гір, а патрэбна яшчэ мінімум 350. Ёсьць 19 пурак, патрэбна некалькі соцень. Прыём збожжа без пурак падаражае яго, бо збожжа прымаецца без уліку якасьці.

Бр.

ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ БУЛЬБАЙ ЛЕНІНГРАДА ПАД ПАГРОЗАЙ

ЗАГАТОЎКІ БУЛЬБЫ ІДУЦЬ ВЕЛЬМІ ДРЭННА

Неадкладна кінуць на загатоўкі ўдарныя брыгады з гораду

БЕЗАГАВОРАЧНА ВЫКАНАЦЬ ВЕРАСЬНЕЎСКІЯ НАРАДЫ

Усім старшыням РВК

У апошнія дні, замест ўзмацненьня, загатоўка і адгрузка бульбы ў Ленінград і Карэлію, ня гледзячы на маю тэлеграму, зусім заняпала.

Стварэецца рэальная пагроза зрыву забесьпячэньня паказаных абласьцей.

У апошні раз прапаную ўсьвядоміць усю важнасьць заданьня, прыняць захады для безадкладнай арганізацыі масавага капаньня, узмацненьня здачы бульбы сялянствам, давядзеньня пляну да сяла, калгасу, кулацка-заможнай гаспадаркі.

Катэгарычна патрабуйце ад загатоўчых арганізацый раёну, якія маюць нарады на вываз бульбы за межы БССР, безагаворачнага 100-проц. выкананьня верасьнеўскіх нарадаў на вываз і агульных плянаў загатовак. Бязьдзейнасьці і чаканьню самацёку павінен быць пакладзены канец.

Вы прызначаны асабіста адказным упаўнаважаным СНК па вашым раёне па загатоўцы і адгрузцы бульбы.

Аналёгічныя захады прымеце супроць слабых загатовак і адгрузак гародніны.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

ЧЫРВОНЫЯ ЭШАЛЁНЫ--НА ЛЕНІНГРАД

— Рэдакцыяй атрымана наступная тэлеграма з Турава: «У адказ на адозву ЦК раённая партыйная арганізацыя згуртавала увесь актыў на перамогу прарываў. Верасьнёўскі плян адгрузкі бульбы ў рабочыя цэнтры выпаканы. Адгружана звыш 30 вагонаў. Пад возка бульбы на станцыі працягваецца. Бульба падвозіцца сотнямі фурманак. У раёне адзначаецца прыліў новых гаспадарак у калгасы.

***

Слуцкі раён абвясьціў сябе ўдарным па загатоўках і адгрузцы бульбы. 27-га адгружана 40 вагонаў, 28-га—44 вагоны. Адгрузку бульбы тармозіць позьняя падача вагонаў.

Слуцак пастанавіў арганізаваць чырвоныя эшалёны з бульбай для пралетарскіх цэнтраў СССР. Эшалёны будуць накіраваны 5,7,10 і 12 кастрычніка.

Учора бюро ЦК камсамолу абмеркавала пытаньне аб дапамозе правядзеньню бульба-загатовак. Вылучаны адказныя таварышы для дапамогі загатоўчым арганізацыям. Камсамол БССР бярэ на сябе абавязак да 15 кастрычніка адгрузіць у Маскву 500.000 пуд. бульбы. Пастаноўлена правесьці мабілізацыю камсамольцаў па ўборку ўраджаю бульбы.

Ударныя рабочыя брыгады--на копку бульбы

Учора за подпісамі старшыні ЦСПСБ т. **Рыжова**, упаўнаважанага па ўборцы ўраджаю т. **Рачьцкага** і ўпаўнаважанага СНК па загатоўках т. **Балціна** паслана ўсім райвыканкомам і ўсім райпрафсаветам тэлеграма аб узмацненьні ўборкі ўраджаю бульбы і гародніны.

— Тэмпы ўборкі ўраджаю бульбы і гародніны ні ў якім разе не адпавядаюць тым плянам, якія мы павінны выканаць.

Амаль ва ўсіх раёнах да гэтага часу не арганізавана масавае капаньне бульбы і ўборка гародніны, як у індывідуальным сэктары, так і па калгасах і саўгасах. Злачынна марудна выконваюцца пляны загатовак і адгрузак бульбы ў аснoўныя пралетарскія цэнтры Саюзу. Прафсаюзныя масы не прыцягнуты на дапамогу калгасам і саўгасам. Гэткая інэртнасьць у адносінах да важнейшай палітычнай кампаніі, пры адсутнасьці рабочых рук у калгасах і саўгасах, зьяўляецца самай шкоднай недаацэнкай становішча.

З прычыны гэтага ўжо зараз мы маем рэальную пагрозу зрыву пляну загатовак і забесьпячэньня прамысловых цэнтраў БССР і Саюзу.

Гэткаму становішчу трэба зараз-жа пакласьці канец.

Усім райпрафсаветам прапануецца зараз-жа зьвязацца з райкалгасаюзамі і ўсімі саўгасамі, выяўляючы іх патрэбнасьць у працоўнай сіле. Патрэбную рабочую сілу мабілізаваць з членаў саюзу, утрыманцаў-служачых і рабочых, якія не заняты на вытворчасьці.

Сярод насельніцтва трэба павесьці шырокую растлумачальную кампанію за найхутчэйшую ўборку бульбы і гародніны. Пры правядзеньні бульба-загатовак трэба шырока ужываць мэтады сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Справа загатовак і ўборкі ўраджаю бульбы і гародніны павінна быць узята пад пільны рабочы кантроль. Трэба вылучыць рабочыя ўдарныя брыгады для пасылкі ў найбольш адсталыя раёны.

Трэба дабіцца пералому ў самым хуткім часе. Пляны рэальны і павінны быць выкананы ва што-б там ні стала.

ПРАРЫЎ НА ФРОНЦЕ С.-Г. БУДАЎНІЦТВА—

вынік бязьдзейнасьці мясцовых арганізацый, кіраўніцтва капгасаў і саўгасаў

Белкалгасбуд выканаў толькі 16 проц. сваёй праграмы

Мабілізаваць масу на ліквідацыю прарыву, пераключыцца на ўдарныя тэмпы, скарыстаўшы астатак сэзону

Матар'ялы аб ходзе будаўніцтва ў БССР з усёй яскравасьцю гавораць, што сельска-гаспадарчае будаўніцтва фактычна на зрываецца. Такі малюнак у тэй ці іншай ступені па сельска-гаспадарчым будаўніцтве, якое відуць усе сыстэмы. Работы ідуць аднолькава дрэнна як у саўгасах, так і калгасах.

Даволі адзначыць такі абуральны факт. Калгасы да гэтага часу не скарысталі звыш 10 млн. руб. на будаўніцтва, якое яны павінны былі выконваць, галоўным чынам, гаспадарчым парадкам. Асноўная прычына гэтага зьявішча тое, што калгасы не зразумелі ўсю важнасьць выкананьня будаўнічай праграмы і не мабілізавалі калгасныя масы на ажыцьцяўленьне гэтай задачы. Работа ў калгасах ня была арганізавана так, каб адпаведную колькасьць рабочае сілы можна было-б кінуць на будаўнічы фронт. Калектывы таксама не пакланаціліся загатовіць сабе своячасова патрэбныя матар'ялы. Бязьдзейнічалі і арганізацыі на мясцох.

Ня лепш з будаўніцтвам, якое вядзе па лініі сельскай гаспадаркі Белкалгасбуд. Гэта тым больш недапушчальны факт, што Белкалгасбуд узяў на сябе выкананьне самых буйных і важнейшых аб'ектаў. Нядаўна спэцыяльная брыгада газэты «Социалистическое Земледелие» абсьледвала дзейнасьць гэтай арганізацыі і ход работ, якія ёю выконваюцца. Брыгадай выяўлены даволі сумны малюнак дзейнасьці Белкалгасбуду. На гэтым варта спыніцца больш падрабязна.

Ня гледзячы на тое, што Белкалгасбуд пачаў працаваць у пачатку 1930 г., ён усё яшчэ працуе бяз пляну.

На 1 верасьня ім былі выкананы толькі 15,6 проц. узятых на сябе абавязкаў на дагаварох, якія складаюць суму ў 10.852.000 руб. Будаўніцтва, якое выкананa за лета, ацэньваецца ўсяго ў 1.692.000 руб.

Дзе прычыны такога палікага прарыву?

Сам Белкалгасбуд у значнай ступені тлумачыць гэта недахватам патрэбных тэхнічных кадраў. Брыгада не згадзілася з гэтым і даказала няправільнасьць такога пункту погляду. Аказалася, што Белкалгасбуд у асноўным укамплектаваны кадрамі, а апарат яго можа выканаць вызначаную праграму. І саўгады, хоць гэтая арганізацыя маладая, але яна ўжо пасьпела ўкамплектаваць як сваю цэнтральную кантору, так і свае органы на мясцох 10 інжынэрамі, 40 тэхнікамі і 96 дзесятнікамі. Такім чынам, на аднаго інжынэра ў сярэднім прыпадае будаўніцтва ўсяго толькі на 1 млн. руб., а на аднаго тэхніка—прыблізна на 250.000. Калі ўлічыць агульны недахват будаўнічых кадраў, стандартнасьць і нескладанасьць сельска-гаспадарчага будаўніцтва, дык наяўную колькасьць кадраў у Белкалгасбудзе трэба ўвогуле прызнаць выстарчальнай.

Асноўныя прычыны прарыву тлумачацца зусім іншымі ненармальнасьцямі. Мае месца няправільная, нерацыянальная ў некаторай частцы, расстаноўка тэхнічных сіл. Ёсьць, напрыклад, такі факты, калі будаўніцтвам коштам у 0. млн. руб. кіруе дзесятнік, а будаўніцтвам коштам у 200.000 руб. загадвае тэхнік.

Трэба наогул сказаць, што будаўніцтва сьвінсаўгасаў, хаця яму і больш усяго аддаецца ўвагі з боку Белкалгасбуду, праходзіць вельмі марудна. Ён складае аналь 50 проц. усёй будаўнічай праграмы. Між тым, на сёняшні дзень Белкалгасбуд выканаў усяго калі 10 проц. будаўніцтва на сьвінсаўгасах. Работы часта тармозяцца спрэчкамі паміж адміністрацыяй саўгасаў і прарабамі. Няма дагаворанасьці, імкненьня на месцы своячасова разьбіраць і ліквідаваць тыя ці іншыя ненармальнасьці. За вырашэньнем усякіх дробязяй і дырэктары саўгасаў і прарабы лічаць неабходным абавязкова зварачацца непасрэдна ў Менск.

Няўгодненасьць наглядаецца і ў рабоце апарату Белкалгасбуду. Адзін сэктар часта ня ведае, што робіць другі.

На ходзе будаўніцтва, бязумоўна, адбіўся недахват рабочай сілы, дрэнная забесьпячэньне будаўнічымі матар'яламі.

Характэрна, што сапраўдная барацьба з усімі гэтымі ненармальнасьцямі не вялося, бо мае месца поўная адсутнасьць уцягненьня мас і грамадзкасьці ў работу будаўнічай арганізацыі. Да сацспаборніцтве і ўдарніцтве на будаўніцтвах Белкалгасбуду ня чуваць. Гэта лепш за ўсё характарызуе бязьдзейнасьць прафсаюзных і партыйных арганізацый на мясцох.

Прымаючы пад увагу сканчэньне ўборкі ўраджаю і павялічэньне ў сув

Безнаяўныя разьлікі —у быт працоўных

Выкананьне пляну вялікіх работ патрабуе ня толькі напружаньня ўсіх сіл і энэргіі рабочай клясы, але і актыўнага матар'яльнага ўдзелу ў сацыялістычнай рэканструкцыі краіны.

Агульная сума сродкаў, якая павінна быць укладзена ў сацыялістычнае будаўніцтва на працягу 5 год, дасягае вялізарнай лічбы ў 86 млр. руб.

Паводле пяцігадовага пляну, ашчадныя касы павінны ўцягнуць вольных сродкаў насельніцтва — 1.273 млн. руб.

Гэта задача можа быць выканана толькі пры ўмове адпаведнай перабудовы апарату ашчадкас, набліжэньня яго да насельніцтва, штодзённай растлумачальнай работы сярод укладчыкаў, належнага кіраўніцтва партыйных і прафесыянальных арганізацый.

Адно з мерапрыемстваў, якое павінны праводзіць ашчадкасы — гэта шырокае ўжываньне безнаяўных разьлікаў.

Безнаяўныя разьлікі даюць магчымасьць кожнаму працоўнаму рабіць усе кія рэгулярныя грашовыя апэрацыі (плаціжы за кватэру, ваду электраэнэргію, членскія ўзносы, выпіска газэт) без уняясеньня грошай, шляхам распараджэньня ашчадкасе, праз жыра-загад, — аплаціць гэтыя сумы. Ашчадкасы сьпісваюць плаціжы з бягучага рахунку ўкладчыка. Карыстаньне жыра-загадамі пры плацяжох — гэта пераняесьне грошай з аднаго рахунку на другі.

Безнаяўныя разьлікі даюць магчымасьць пакрыць усю суму плаціжкоў за адзін раз, пазбаўляць платніка ад патрэбнасьці наведаць некалькі ўстаноў, пры карыстаньні безнаяўнымі разьлікамі платнік можа навет не зьяўляцца ў ашчадкасу. Ён павінен зрабіць распараджэньне, шляхам жыра-загаду (па ўстаноўленай картцы), які можна пераслаць у ашчадкасы, апускаючы яго ліст марак у любую паштовую скрынку.

Безнаяўныя разьлікі даюць магчымасьць дзяржаве скарыстаць на індустрыялізацыю краіны вялікую частку грошай, якія знаходзяцца ў звароце.

Калі прыняць пад увагу, што пэнсія працоўных складае больш 10 млр. руб., што гэтыя грошы, пры ўжываньні наяўных разьлікаў, павінны шмат разоў пераходзіць з рук у рукі, становіцца зразумелай вялікая карысьць і вялікая эканомія часу і сродкаў ад ужываньня безнаяўных разьлікаў.

Безнаяўныя разьлікі даўно ўжо ўжываюцца ў Англіі і ў Нямеччыне. Там капіталістычныя прадпрыемствы ніколі ня трымаюць у касах лішніх сродкаў, пасельніцтва таксама шырока карыстаецца жыра-загадамі пры розных плаціжох.

У нас у СССР безнаяўныя разьлікі сталі ўжывацца нядаўна. Асабліва шырока яны распаўсюджаны ў Маскве. Значна слабей карыстаюцца імі ў БССР. Гэта тлумачыцца неазнаямленьнем шырокіх мас з выгадамі безнаяўных разьлікаў, слабай растлумачальнай работай і поўнай бяздзейнасьцю нізавых камісій садзейнасьці.

ЧАКОРСКАЯ.

Дзе выразныя дырэктывы Белкаапсаюзу?

БССР уступіла ў паласу ўзмоцненых зброжка-бульбазагатовак. Значнае месца ў гэтых загатоўках належыць спажывецкай кааперацыі. Ад штаба спажыўкаапэрацыі — Белкаапсаюзу патрабуюцца ўдарныя тэмпы і выразныя дырэктывы.

Між тым рад матар'ялаў, выяўленых брыгадзірамі ЦКК-РСІ, сыгналізуюць аб буйных прарывах у рабоце апарату Белкаапсаюзу. Прыкладам «узорнай» работы можа служыць наступная тэлеграма: «Менск, 13 верасьня 1930 году. Касьцюковіцкаму Райпо. Хлебам забясьпечвайце бесьперабойна. Нарадам зьвярнецеся Бабруйск. Саюзхлеб. Беднаце вердсьні не забясьпечвайце —Белкаапсаюз».

Апрача таго, што наогул трэба ад Белкаапсаюзу і нашай наважнай пошты патрабаваць больш яскравага і зразумелага складаньня тэлеграм — нас цікавяць два пытаньні:

1) Чаму гэта Касьцюковіцкаму Райпо трэба атрымліваць нарады з Бабруйску, а ня з больш блізкіх кантор «Саюзхлеба» (напрыклад Клімавічы).

2) Калі беднату ў верасьні ня трэба забясьпечваць, дык каго трэба забясьпечваць.

Мы зьвярнуліся за растлумачэньнем да работніка Белкаапсаюзу, які ведае гэтай справай, тав. **Белавуса.**

Межа Белкаапсаюз адкажа нам праз «Зьвязду».

Эпштэйн.

Ліквідаваць падзеж жывёлы

Паводле даных статыстыкі дзяржстраху, за апошнія тры гады ў сярэднім па БССР штогодна прападала ва ўзросьце ад 2½ год каля 42.000 шт. буйной рагатай жывёлы і 43.000 коняй. Апошні год даў вымушэньне падзяку жывёлы. Зьмяншэньню спрыяла арганізацыя калгасаў, якія зьяўляюцца найбольш культурнай формай вядзеньня сельскай гаспадаркі, дзе жывёла ўтрымліваецца ў лепшых умовах, чым у адзінаасобных гаспадарках.

Аднак, трэба яшчэ прыняць рад мер, каб вусім зьнішчыць падзеж жывёлы.

Трэба забясьпечыць жывёлу кармамі на вімовы пэрыяд, адрамантаваць і ацяпліць аборы, захаваўшую жывёлу адлучаць ад здаровай і зьмяшчаць у спэцыяльна пабудаваных ізалятарах, шырока папулярызаваць мерапрыемствы па барацьбе з эпізоотыямі жывёлы.

РВК і сельсаветы павінны ўзмацніць барацьбу са зьнішчэньнем жывёлы, у мэтах спэкуляцыі мясам. Вінаватых трэба прыцягваць да адказнасьці. Дзяржстрах паставіў перад адпаведнымі органамі пытаньне аб адмаўленьні ў выплаце страхоўкі сялянам, якія зьнішчаюць жывёлу.

Ф. Ш.

МЕНСК

Упарадкаваць вулічны рух

За апошні час аварыі з аўтамашынамі набылі пагражаючы характар. Са строю выходзіць рад аўтамашын, у той час, калі кожная машына, у сувязі з крызісам транспартных сродкаў, вельмі патрэбна.

Аварыі адбываюцца па дзьвёх прычынах—з-за хуліганства паасобных шофэраў, вельмі хуткай язды, псаваньня машын, а таксама з-за поўнай адсутнасьці правіл вулічнага руху.

Наша грамадзкасьць лічыць гэтыя аварыі нямінучым злом, мяркуе з імі, адносіцца да іх як да любога штодзённага здарэньня.

Прапануем: **безадкладна правесьці ва ўсіх гарадох каротнатэрміновыя курсы па навучэньні міліцыянэраў правілам вулічнага руху і элемэнтарным асновам аўтамабільнай справы.**

Прафарганізацыі і Аўтадор павінны вылучыць таварышоў, якія будуць мець спэцыяльныя мандаты ад Галоўдартрансу на права нагляду за нармальным аўтамабільным рухам. Максымальная хуткасьць легкавога аўтамабіля 25 кілёмэтраў у гадзіну, грузавога—20.

Трэба арганізаваць з аўтадораўцаў **дружыны парадку,** якія могуць штрафаваць за парушэньне правіл вулічнага руху.

Просім НК Унутраных Спраў, Галоўдартранс, гарсавет тэрмінова заняцца гэтым пытаньнем.

ЦП Аўтадору БССР.
ЦП саюзу транспартных рабочых.

Артыстыя—на дапамогу калгасам

Агульны сход работнікаў 2-га Беларускага дзяржаўнага тэатру, абмеркаваўшы адозву ЦК УсеКП(б), абвясьціў сябе мабілізаванымі і прымацаванымі да прадпрыемства да сканчэньня пяцігодкі. Агульны сход даручыў мясцкому арганізаваць рад культвылазак на буйныя фабрыкі і заводы, а таксама выезды ў калгасы і саўгасы.

Навіны МЦРК

— З сёнешняга дня МЦРК пачынае адпускаць пайшчыкам 2 і 3 катэгорыі нітні на аднэй шпульцы на чалавека, па талёну жоўтага колеру № 100 і наборных картках № 11.

— Па дзіцячых кніжках МЦРК пачынае адпускаць з сёнешняга дня па аднэй вязаной шапцы, аднэй пары рукавічак, адным ручніку і па пары дзіцячых рэйтузаў.

— З сёнешняга дня МЦРК пачынае адпускаць за кастрычнік месяц **крупы**— для 1-й катэгорыі 1½ кілё на едака, іншым катэгорыям—па 1 кілё; **селядцоў**— 1 кілё для 1-й катэгорыі, іншым—500 грам на едака; **гарбаты**—для 1-2 едакоў 50 грам, для 3 і звыш—100 грам і **мыла гаспадарчае** па ½ кавалка для 1-й катэгорыі і па ¼—для іншых.

Чым гэта растлумачыць

Пастаўніца Дукорскай сямігодкі **Булат** свае прадметы—хэмію і прыродазнаўства выкладае выключна па-расійску.

Ужо некалькі раз рабіліся заўвагі т. Булат аб тым, каб выкладаньне яе прадметаў яна вяла па беларускай мове. Але заўвагі, так і засталіся заўвагамі.

Селькор.

За аўладаньне марксыцка-ленінскай тэорыяй

(Аб завочна-курсавым аддзяленьні Камвузу Бел.)

Улічваючы імкненьне да вывучэньня марксысцка-ленінскай тэорыі, да атрыманьня вышэйшай палітычнай адукацыі шырокіх колаў партыйнага актыву і адсутнасьць магчымасьці на працягу доўгага тэрміну вывучаць яго ў школьным парадку (у сьценах Камвузу), **КУБ перабудоўвае работу завочнага Камвузу з тэй мэтай, каб даць магчымасьць таварышам, шляхам завочна-курсавога навучаньня на працягу чатырох год поўнасьцю прайсьці праграму дзённага Камвузу і атрымаць адпаўковыя веды, як і на асноўных аддзяленьнях КУБ'а.**

Для ажыцьцяўленьня гэтай мэты будуюцца завочна-курсавыя аддзяленьні (парт. будаўніцтва і прапагандысцкае з цыкламі: гістарычным і эканамічным), на якіх завочнае навучаньне чаргуецца з курсавым, г. зн. што 8 месяцаў студэнты навучаюцца завочна, а на два месяцы выклікаюцца ў камвуз на курсы штогод, а ў апошні год—на 6 месяцаў.

Завочна-Курсавое навучаньне на працягу першага году арганізуецца так, каб таварышы, выканаўшыя ўсе заданьні і пасьпяхова прайшоўшыя 2-х месячнае курсавое навучаньне, **маглі-б паступіць на другі курс дзённага Камвузу бяз іспытаў.**

Мерапрыемствы, якія робяцца для ажыцьцяўленьня гэтага Камуністычным Унівэрсытэтам Беларусі імя **«Леніна»**, павінны сустрэць **актыўную дапамогу з боку ўсіх партыйных органаў і ў першую чаргу РК КП(б)Б.**

Раённыя і гарадзкія камітэты КП(б)Б абавязаны адразу-ж разгарнуць шырокую растлумачальную работу, каб свячасова накіраваць усіх камуністых, жадаючых вучыцца, у Камвуз і ў далейшым аказваць ім належную дапамогу ў іх рабоце.

Макоўскі.

За разбазарваньне мясных фондаў—пад суд

Магілеўскі акруговы суд разглядзеў справу супрацоўнікаў **Бялыніцкага** спажывецкага таварыства—старшыні праўленьня **Шнэрава,** члена праўленьня загадчыка гандлёвага аддзелу **т. Рабіновіча,** члена праўленьня **Лапацёнкава** і супрацоўніка **Сіроткіна.**

Старшыня таварыства Шнэраў і загадчык гандлёвага аддзелу Рабіновіч вельмі нядбайна адносіліся да справы мясазагатовак, у выніку выканаўшы пляну мясазагатова рэзка зьнізілася—з 75 проц. у маі да 27 проц. у чэрвені, і 9 проц. у ліпені. Абодва дапускалі выдаткаваньне мяса звыш вызначанай нормы на мясцовыя патрэбы, выдавалі розным асобам пісулькі на атрыманьне мяса.

Член праўленьня Лапацёнкаў таксама нядбайна адносіўся да справы мясазагатовак.

Супрацоўнік Сіроткін, па сваёй ініцыятыве, зарэзаў карову, а мяса раздаў супрацоўнікам міліцыі і сваім знаёмым. Сіроткін вельмі нядбайна адносіўся да сваіх абавязкаў.

Суд прыгаварыў Шнэрава і Рабіновіча да пазбаўленьня волі на 6 мес. кожнага. Прымаючы пад увагу, што на працягу ўсёй іх работы ў кааперацыйных арганізацыях ніякіх злоўжываньняў за імі ня было заўважана, суд замяніў ім пазбаўленьне волі прымусовымі работамі на 6 мес.

Лапацёнкаў прыгавораны да 4 мес. прымусовых работ, пры чым гэта пакараньне лічыцца ўмоўным па працягу году.

Сіроткін прыгавораны да 1 г. 6 мес. зьняволеньня.

ПАСЬПЯШЭЦЕСЯ здаць падпіску на **КАСТРЫЧНІК** да канца году

НА ГАЗЭТУ **„ЗЬВЯЗДА“** ОРГАН ЦК КП(б)Б

Падпісная плата з дармовым дадаткам „ПРАФРУХ“ на 1 мес.—90 кап., да канца году 2 р. 60 кап.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:

У МЕНСКУ: Газ. к-рай газ. «Зьвязда» (Савецкая, 63), газэтным бюро, газэтаносцамі, бюро падпіскі «Кніга-поштай» БДВ.

У ПРАВІНЦЫІ: Усімі паштовымі канторамі, аддзяленьнямі БДВ, спэцыяльнымі ўпаўнаважанымі.

Да 1-га кастрычніка застаецца толькі **2 дні.**

СВАЯЧАСОВАЯ падпіска гарантуе АКУРАТНУЮ і бесьперабойную дастаўку газэты.

З лістоў рабселькораў

РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАЗЫКІ «ПЯЦІГОДКА — ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ» ПРАХОДЗІЦЬ МАРУДНА

Распаўсюджаньне пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады» па **Хоцімскім** раёне праходзіць без належнае ўвагі з боку РВК і райкамсода. РВК і райкамсод супакоіліся на тым, што разьмеркавалі агульныя лічбы па с-саветах.

Ніякай растлумачальнай работы ня было праведзена. У выніку гэткай пастаноўкі работы рэалізацыя пазыкі ў с/саветах сярод сялян праходзіць вельмі марудна. Ні ў адным с/савеце ня выканана заданьне. Найвышэйшы процант выканаўшыя ў **Екацярынеўскім** с/савеце складае 59 проц., **Чарняўскі** с/савет выканаў заданьне на 0,6 проц., Васілеўскі — на 57 проц. Калгасьнікі таксама ня ўцягнуты ў падпіску на пазыку. З 35 калгасаў падпіска праведзена толькі ў 3-х.

Добра прайшла рэалізацыя пазыкі ў самым **Хоцімску** сярод рабочых і служачых, дзе агульная сума складае 16.435 руб., альбо 150 проц.

РВК і камісіям садзейнасьці трэба зьвярнуць увагу на вузкія месцы.

А. З.

САМАГОНШЧЫК НА ВЫЛУЧЭНЬНІ

На заводзе **«Пралетары»** (г. Копысь) да гэтага часу вылучэньне рабочых на адказную працу праводзілася габінэтным парадкам. Гэтую памылку за апошнія часы выправілі. Вылучэньне рабочых праводзілася праз агульныя сходы. Але-ж на вялікі жаль гэтыя прынцыпы нядоўга існавалі. Старый мэтады зноў пачалі ўжывацца. Пры фабрычнай сталоўцы патрэбен быў загадчык, які-б вёў гаспадарку. Замест таго, каб гэтае пытаньне вынесьці на абгаварэньне агульнага сходу і прызначыць прыкладнага рабочага, кімсьці ў габінэтах быў вылучаны **Дамарацкі М.,** які быў вычышчаны з партыі за дрэнныя паводзіны.

Дамарацкі тры гады гандляваў самагонам, 2 разы судзіўся і быў пазбаўлены выбарчых правоў. Ён таксама сыстэматычна п'янстваваў і рабіў цэлы рад злачынстваў.

Ставіцца пытаньне: няўжо-ж на заводзе **«Пралетары»** няма лепшых рабочых за **Дамарацкага?** Адсюль можна зрабіць так вывад, што парткалектыў і райком ня цікавяцца пытаньнем вылучэньня. Такую памылку неабходна зараз-жа выправіць. Для самагонщыкаў і злосных работнікаў ніякіх вылучэньняў не павінна існаваць.

Рабочы.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ, 29 ВЕРАСЬНЯ

— **Дом Асьветы.** А 7 гадз. увеч. адбудзецца адкрыты сход калектыву ЛКСМБ працасьветы. Яўка абавязкова.

— **Наргас БДУ.** А 8 з пал. гадз. увеч. адбудзецца агульны сход навуковых працаўнікоў і студэнцтва наргасу БДУ па пытаньні аб разглядзе заяў аб прыёме ў асьпіранты. Асабіста выклікаюцца т. т.: Сыцько, Скуман А. Т., Зісьнер А. Я., Цырульнік А. М., Мацьвеенка І. Т., Нехай К. С., Рыбакоў А. А., Іванчык Я. А., Барушка А. Т., Казлоў Ц. І., Разьнік Е. С., Корсікаў Х. М. і навуковыя працаўнікі: С. Я. Вальфсон, Ноткін, Ганін (НДІ), Лясноўскі. Сход адбудзецца ў габінэце эканомікі наргасу (гал. корп. Унівэрс. Гарадка).

Заняткі на І і ІІІ курсах наргасу БДУ пачынаюцца 1-га кастрычніка ў гал. корпусе Унівэрс. Гарадка. Усе выкладчыкі павінны папярэдня азнаёміцца з раскладам заняткаў і свячасова зьвяцца для працы.

— **Мясцюм палітэхнікуму.** А 5 гадз. увеч. адбудзецца агульны сход МК. Парадак дня: падрыхтоўка да новага навуч. году і бягучыя справы. Яўка ўсіх выкладчыкаў, рабочых і супрацоўнікаў абавязкова.

— **Вячэрні сэктар Камвузу Беларусі імя Ў. І. Леніна** абвяшчае, што заняткі першага курса пачнуцца 29 верасьня а 6 з пал. гадз. увеч. Заняткі трэцяга курса пачнуцца 3 кастрычніка, а 6 з пал. гадз. увеч. Заняткі камсамольскага аддзяленьня пры вячэрнім Камвузе пачнуцца 29 верасьня, а 6 з пал. гадз. увеч. Просьба да ўсіх т. т. зьявіцца свячасова.

— А 7 гадз. увеч., у залі пасяджэньняў Менгарсавету, адбудзецца пасяджэньне гарадзкога штабу культаходу. На пасяджэньне павінны зьявіцца наступныя т. т.: Пабітка, Умрэйка (Гарана), Пасынкоўскі (Гарсавет), Кац (культсэктар ЦСПСБ), Суханава (ФРК КП(б)Б), Ежельчык (ФРК ЛКСМБ), Альховы (Кастр. РК КП(б)Б), Буевіч (ЦБ пралетстуду), Шмык (Кастр. РК КП(б)Б), Сяўрук (ЦП працасьветы), Цыпкоў (Калгасцэнтр), Баўх (ф-ка «Акцябр»), Невядомскі (зав. «Энэргія»), прадст. ПБ райкомаў, арганізатары-мэталістыя, прадст. зав. «Бальшавік» і «Камунар». Яўка абавязкова.

— **Пэдфак БДУ.** А 7 гадз. увеч., у Доме Камасьветы, адбудзецца ўрачысты вечар, прысьвечаны датэрміновому выпуску пэдфаку БДУ з удзелам рабочых, партыйных і грамадзкіх арганізацый.

— **Пэдгабінэт.** У 19 гадз. — сход выкладчыкаў мовы і літаратуры.

— **Рабачком Белжылсаюзу** склікае канфэрэнцыю рабочых-ударнікаў Белжылсаюзу, а 7 гадз. увечары, у памяшканьні клюбу будаўнікоў (Энгэльса, 13).

Парадак дня: 1) Вынікі будаўнічай праграмы БЖС на 1930 г. і пэрспэктывы на 1931 г.

2) Бягучыя справы.

ЗАЎТРА, 30 ВЕРАСЬНЯ

— **Дом Асьветы.** А 7 гадз. раніцы—збор асьветнікаў для паездкі ў саўгас «Заціішша» для правядзеньня ўборачнай кампаніі.

— **ЦБ СНП БССР.** А 7 гадз. увеч., у акт. залі БАН, склікаецца агульны сход навук. працаўнікоў г. Менску. Парадак дня—адозва ЦК УсеКП(б) (дакл. тав. Сіньковіч).

— **БДУ.** А 19 гадз., у 302 аўд., гал. корп., 3-ці паверх, адбудзецца агульны сход усіх нанава паступіўшых на факультэт сав. буд. і права на асноўнае і вячэрняе аддзяленьні. Яўка ўсіх студэнтаў абавязкова.

Заняткі на 1-м курсе ф-ту сав. будаўніцтва і права БДУ пачынаюцца і кастрычніка а 8 гадз.—асноўнае аддз. і 17 г. 25 м.—вяч. аддз.

— **БАН.** А 12 гадзіне дня ў памяшканьні Катэдры Марксызму і Ленініўму (3 паверх, пакой № 15) адбудзецца адкрытае пасяджэньне Катэдры, на якім будзе заслухан даклад т. Крывіцкага на тэму: «Этыка Канта, Когана і Адлера». Уваход вольны.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.

Пленум Кастрычніцкага РК МОПР'у

адбудзецца сёньня, 29 верасьня, а 7 гадз. увечары, у памяшканьні РК МОПР'у (рог К. Маркса і Урыцкага).

Прысутнасьць членаў і кандыдатаў РК, членаў і кандыдатаў рэўкамісіі і прадстаўнікоў бюро яч. МОПР'у абавязкова. Запрашаецца актыў.

Кастрычніцкі РК МОПР'у.

Леў і Елізабэта Нэйфах паведамляюць прыяцеляў і знаёмых аб сьмерці пасьля цяжкай хваробы горача любімай маткі

Ф. НЭЙФАХ

Вынас цела з нэрвовай клінікі сёньня, 29 верасьня, а 5 гадзіне дня.

Калектыў супрацоўнікаў рэдакцыі газэты «Зьвязда» выказвае сваё глыбокае спачуваньне таварышу па рабоце Л. Ц. НЭЙФАХУ з прычыны

сьмерці яго маткі Ф. НЭЙФАХ.

КІНО-ТЭАТР **„КУЛЬТУРА“** АД ПАНЯДЗЕЛКА, 29 ВЕРАСЬНЯ

Новы выключна-мастацкі баявік, вытворч. „Саюзкіно“

ПЕСЬНЯ ПРА ПЕРШУЮ ДЗЯЧУКУ

Паводле рамантычнай аповесьці **Н. Багданава.** Сцэнары і пастаноўка **Л. Голуба і Н. Садковіча.** Апэратар **Н. Шах.** Мастак **Уткін.**

У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:

Т. Альцава; В. Чуволеў, П. Брэжнеў, М. Калінін, Н. Івакін.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: **ПАРТЫЯ КЛІЧА** ў 2-х частках.

Спэцыяльны выпуск да «Дня Ўдарніка»

Пачатак 1-га сэансу а 7 г.
» 2-га » а 8 г. 40 м.
» 3-га » а 10 г. 20 м.

Тыя, хто спазьніліся на 15 мінут, у залю не дапускаюцца.

Каса адчынена ад 5 гадз.

Мастацкі **ЦЫРК** Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА

Сёньня, 29 верасьня

Грандыёзныя прадстаўленьні.

НОВЫЯ ГАСТРОЛІ.

Бытавыя вясёлыя чачылышчыні 5 **ЮРАВЫ.**

Музычныя сатырыкі **РЫМ-РОМ.** Гладыятары рымляне **4 ЦАППА**

Чалавек з таямнічымі рукамі ілюзіяніст **ЭД. РАНДЭЦІ.**

Турністыя **4 Ольтэно.** Эквілібрыстыя **2 Реуш.**

І шмат іншых нумароў.

Пачатак роўна а 8 г. увеч.

Праграма ў 3-х аддзяленьнях.

Адказны кіраўнік І. Л. СТРАШЭВІЧ.

Кіно **„ПРАЛЕТАРЫ“.**

Апошнія два дні

Панядзелак, 29 і аўторак, 30 верасьня

Мастацкі фільм, вытворч. Леа-фільм

КАХАНЬНЕ МАРАКА

драма ў 7 частках.

Штодзенна 4 сэансы

Пачатак 1 сэансу а 6 г., 2—а 7 г. 30 м., 3—9 г., 4—10 г. 30 м. Каса адкрыта з 4 г. дня.

Кіно **„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“**

З панядзелка, 29-га верасьня 1930 г.—новы замежны фільм

„АБШАРПАНЫЯ ВЕТРАЗІ“

Кіно-раман у 8 ч.

Рэжысэр—Джэмс Крузо. Гал. апэратар—Альфрэд Джылес.

ШТОДЗЕННА 3 СЭАНСЫ. ПАЧАТАК 1-га А 7 г.

Каса адчынена з 5 гадзін.

Кіно **„ЮНЫ ПІЯНЭР“**

З панядзелка, 29-га верасьня

НОВЫ ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ

„Нямы прыяцель“

кіно-фільм у 6 частках.

Штодзенна 2 сэансы: 1-шы—а 2 г., 2-гі—а 3 г. 30 м.

Каса адчынена з 12 г. дня.

Цана білетаў: для дзяцей да 12 год—10 к. старэй за 12 г.—20 к.

КІНО **„СПАРТАК“** З панядзелка, 29 верасьня ПАДВОЙНАЯ ПРАГРАМА

ДВА ГІГАНТЫ ў 5 частках.

Замежная камэдыя **ЛУІ Ў РАІ** ў 3 частках.

Пачатак сэансаў: 1-га—з 7 г., 2-га—9 г., 3-га 10 г. 45 м.

Каса —ад 6 гадз.

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумантов

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАСАМІ БССР

напамінае трымальнікам **ВЕЛЁАБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ** усіх 4-х сэрый, якія ня ўнесьлі чарговых узносаў па вэлёабавязацельствах, аб **абавязковым**

ЗЬЛІКВІДАВАНЬНІ да 1-га кастрычніка сваёй ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦІ.

На 1-га кастрычніка ПАВІННА БЫЦЬ УНЕСЕНА:

Па вэлёабавязацельствах	1-й сэрыі	. .	73 руб.
„ „	2-й „	. .	55 „
„ „	3-й „	. .	34 „
„ „	4-й „	. .	28 „

У выпадку незьліквідаваньня да 1-га кастрычніка поўнасьцю запазычанасьці, вэлёабавязацельствы будуць анулываны і распаўсюджаны сярод другіх працоўных.

Кіраўніцтва Ашчадкасамі БССР.

МЦРК

даводзіць да ведама ўсіх будаўнічых арганізацый, што

ДЛЯ АТРЫМАНЬНЯ СЭЗОННЫХ КАРТАК

неабходна прадставіць у стол найшчыкаў МЦРК патрабаваньні адміністрацыі і імянны сьпіс з подпісам кожнага рабочага, на каго гэтыя карткі выдаюцца. Бяз гэтага сталом найшчыкаў МЦРК карткі сэзоньнікам выдавацца на будуць.

Імпартны аддзел Дзяржгандальбелу

даводзіць да ведама ўсіх сваіх пакупцоў, што з 30 верасьня па 10 кастрычніка 1930 г.

ІМПАРТНЫ СКЛАД БУДЗЕ **ЗАЧЫНЕНЫ**

з прычыны перавучоту астачы тавараў і ніякіх водпускаў рабіцца ня будзе.

Імпартны аддзел.

МЕНСКІ ПАЛІТЭХНІКУМ

паведамляе

ўсіх студэнтаў, прынятых на І-шы КУРС, што вызаў іх на заняткі будзе праводзіцца ў два прыёмы.

Студэнты, якім зараз рассылаюцца спэцыяльныя позвы з паказаньнем зьявіцца 1-га кастрычніка 1930 году, павінны прыбыць у тэхнікум 1-га кастрычніка а 9 гадз. раніцы.

Студэнты, якім зараз рассылаецца паведамленьне, што яны выклікаюцца на заняткі 1-га студзеня 1931 году, зараз не павінны ехаць у тэхнікум, бо тэхнікум іх зараз ня прыме і ніякай матар'яльнай адказнасьці не нясе за страту сродкаў на праезд.

ДЫРЭКЦЫЯ ТЭХНІКУМУ.

МАГІЛЕЎСКІ **ДАРОЖНА-БУДАЎНІЧЫ ТЭХНІКУМ**

АБВЯШЧАЕ:

што прыём заяў па групе рабочых **працягнуты да 30 верасьня.**

Да заявы патрэбна далучыць анкету і усе неабходныя дакументы, згодна даведніка НК Асьветы.

Пачатак заняткаў на першым курсе 5 кастрычніка, на другім курсе—1 кастрычніка.

Іспыты нескончыўшым сямігодку—2 кастрычніка. Здача абавязковых работ на тэарытычных дысцыплінах для студэнтаў другога курсу 25 верасьня.

АДРАС: Магілеў, Ленінская вуліца, № 43.

Частка студэнтаў забясьпечваецца стыпэндыяй і інтэрнатам.

За начальніка тэхнікуму ПАЎЛАЎ.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА

УКЛАДЧЫКАЎ АШЧАДКАС,

што ў сувязі з складаньнем гадавой справаздачнасьці і правядзеньнем інвэнтарызацыі

МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ АШЧАДКАСА № 16

30-га верасьня будзе зачынена.

1-е аддз. (пляц Волі) у гэты дзень будзе адчынена **да 13 гадз.**

Менская гарадзкая ашчадкаса № 16.

Галоўнае кіраўніцтва шосавых і грунтавых дарог і аўтатранспарту БССР

ГЭТЫМ АБВЯШЧАЕ, ШТО

працягваецца прыём у Аршанскую школу

„ДОРСТРОЙУЧ“

па падрыхтоўцы мэханікаў-машыністых і цесьляроў.

Тэрмін навучаньня 2 гады. У «Дорстройуч» прымаюцца асобы абодвага роду, скончыўшыя 7-годку, вячэрнія школы рабочай моладзі і школы сялянскай моладзі, а таксама і асобы, якія маюць адукацыю за 4, 5 і 6 груп 7-гадовай школы. Узрост 16-18 год. Паступаючыя павінны прысылаць наступныя дакументы: пасьведчаньне аб адукацыі, анкету, засьведчаную РВК або адпаведнай установай, мэтрычную даведку, даведку аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, даведку аб с.-г. падатку ў 1930 г. (для сялян), даведку аб выбарчых правах, даведку аб стане здароўя і фізычным разьвіцьці. Усе залічаныя ў школу «Дорстройуч» задавальняюцца стыпэндыямі ў суме 25 руб. у месяц і інтэрнатам.

УВАГА: У школу «Дорстройуч» залічваюцца рабочыя, батракі, батрачкі, дзеці рабочых, бедняты, калгасьнікаў, служачых, саматужнікаў, якія знаходзяцца ў кааперараваных аб'яднаньнях, і дзеці ўсіх тых, хто не пазбаўлены выбарчых праў.

Заявы прымаюцца ў канцылярыі школы (г. Ворша, Ленінская вул., № 57) штодзенна ад 12 да 16 гадз. дня да 5-га кастрычніка 1930 г.

ГАЛОЎДАРТРАНС БССР.

Навукова-дасьледчы інстытут сьвінагадоўлі

Акадэміі с.-г. Навук імя Леніна

ПАТРЭБНЫ: Старшы бухгальтар. Бухгальтар. Загадчык бібліятэкай. Загадчык музэем.

УМОВЫ АПЛАТЫ ПА ЗГОДЗЕ.

Заявы падаваць да 10 кастрычніка 1930 г. па адрасе: Менск, Інстытут Сьвінагадоўлі.

ЗАВОЧНЫЯ БУХГАЛЬТАРСКІЯ КУРСЫ

Прыём слухачоў праводзіцца кругла год.

Прымаюцца асобы з 17-годовым узростам а асьветай ня ніжэй 5 гр. 7-годкі.

ПЛАТА ЗА КУРС 33 руб.

праводзіцца так: 9 руб. пры паступленьні на курсы, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8-ы месяц і па 4 руб. на працягу 6 месяцаў у пачатку кожнага навучальнага месяца.

Заявы, запытаньні і грошы накіроўваць па адрасе: Менск, пошта, скрынка 44, Завочным курсам.

На адказ прыкладаць 2 маркі па 10 кап.

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск.

Менск. Галоўлітбел 337.